КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 33 (209) ◂ 17 верасня ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



БОЙ З БЮРАКРАТЫЧНЫМ ЦЕНЕМ

Стар. 4

**БЕСПРАЦОЎЕ ПА-БЕЛАРУСКУ**

Узровень беспрацоўя апусціўся ніжэй за 1 працэнт ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Гэта настолькі супярэчыць высновам падручнікаў па эканоміцы, што патрабуе спецыяльных тлумачэнняў

Стар. 6

**ХРОСНЫ МЭР**

Пра тое, чаму пад удар трапіў мэр Лужкоў, журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з маскоўскім сацыяльным актывістам Андрэем Сахніным

Стар. 12

**ЧАЛАВЕК-АРКЕСТР**

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ВЯЧАСЛАЎ СІЎЧЫК**

Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Трэці сектар у асобах»

▸ ВЫБАРЫ–2010

# ВАРАЖБА НА КАЛЯДЫ

Вольга ХВОІН

**Вырашана — 19 снежня час «Х». «Надакучыў!», «Пераменаў!», «Новага жыцця!» — з такімі тэзамі (калі па сакрэту, вядома) пагодзяцца ў кухонных размовах многія. За тры месяцы да прэзідэнцкіх выбараў Беларусь мае ледзь не тузін альтэрнатыўных кандыдатаў. І сумнеўна, што яны гатовыя да «штурму» розумаў і сэрцаў выбарцаў, прагнозу падзей і здольныя самастойна, рашуча дзейнічаць у экстрэмальнай сітуацыі.**




Яшчэ на мінулым тыдні чакалася, што парламент на пазачарговай сесіі прызначыць час, калі беларусам ісці з бюлетэнямі да ўрнаў. Але абстаноўка ў каляпалітычных колах унутры і па-за межамі краіны надта накалілася, і парламент тады дыпламатычна абмежаваўся разглядам бюджэту. Таямнічая смерць апазіцыйнага журналіста Алега Бябеніна кінула цень на рэпутацыю ўладаў, і так падмочаную інфармацыйнымі войнамі з Расіяй і перыядычнымі зачысткамі ўнутранай прасторы. Цягнуць час не было куды.

Уласна, да выбараў дзяржаўны апарат рыхтуецца ці не з вясны. Ператрэслі і пасадзілі на прафілактычныя суткі будучага апанента Лукашэнкі Уладзіміра Някляева, арганізавалі сістэмныя ператрусы і допыты ў супрацоўнікаў найбольш масавых апазіцыйных інфармацыйных рэсурсаў («Народная воля» і «Хартыя»), абнавілі папярэджанні Мінінфармацыі рэдакцыям недзяржаўных газет «Новы час» і «Наша ніва». Усё гэта апазіцыя зносіла досыць цярпліва. А калі распачаліся інфармацыйныя войны з Масквой, дык сёй-той нават пэўныя надзеі з расійскім бокам звязаў.

Асяродак насамрэч ускалыхнуўся толькі пасля смерці Бябеніна. Невытлумачальная і нечаканая, яна стала напамінам, што парадам кіруюць з Карла Маркса, і кожны мусіць пра гэта памятаць. Падзею падхапілі СМІ, у тым ліку і з-за мяжы. Натуральна, версіі пра інсцэніроўку самазабойства перацякаюць з аднаго рэпартажу ў другі, рытарычнае пытанне «каму гэта трэба?» не знаходзяць адказу, як, зрэшты, і апазіцыя застаецца пакуль, з чым была. Бо інфармацыйныя хвалі паступова сціхаюць, а галовы выбарцаў не надта хвалюе, хто такі Бябенін і што з ім здарылася. Мала раздаваць інтэрв'ю, трэба яшчэ і даваць веру, упэўненасць у альтэрнатыве.

Тым часам рэжым Лукашэнкі, відаць, спрабуе згуляць на добра адпрацаванай ідэі знешняга ворага. Не так даўно ў сеціве з'явіўся відэазапіс «ананімнага супрацоўніка спецслужбаў Расіі», які расказвае, што на беларускага кіраўніка па загаду Пуціна быццам бы рыхтуецца замах. У праўдзівасць гісторыі наўрад ці хто паверыў, але гэты факт адцягнуў увагу ад іншых персон і перавёў стрэлкі ў больш прывабны бок. Маўляў, на самога прэзідэнта замахнуліся ворагі, а вы тут са сваім журналістам носіцеся. Мудры кіраўнік у коле ворагаў — папулярная ідэя, якая перыядычна падпітваецца.

Аляксандр Лукашэнка, каб даказаць ці то беларусам мудрасць, ці то лаяльнасць Крамлю, рассыпаўся абяцаннямі міру генсеку АДКБ Мікалаю Бардзюжу, калі той наведваў Беларусь. «Беларусь хвалююць адносіны з нашым галоўным партнёрам у АДКБ — Расійскай Федэрацыяй. Але, нягледзячы на тое, што расійскае кіраўніцтва нас пастаянна апошні час цапае за розныя часткі цела, мы не завастрыліся на яго так, як, можа быць, некаторыя думаюць, — прымірэнча заявіў беларускі лідэр. — Мы заўсёды былі і будзем разам, і ніякім палітыкам не наканавана разарваць нашы адносіны. І ў гэтым ключы мы будзем весці сваю палітыку без залішніх прэтэнзій, наскокаў на сваіх партнёраў».

Цікава, што год таму вакол АДКБ Беларусь разыгрывала чарговыя ціхія шантажы. Перад выбарамі змянілася расстаноўка сілаў, умовы, і беларускі кіраўнік прывычна загаварыў пра сяброўства і адданасць. Але чорная котка ўжо прабегла паміж Мінскам і Масквой, і апошняя наўрад ці адмовіцца падтрымаць альтэрнатыву Лукашэнку, калі чалавек будзе больш адэкватны і прадказальны, а ўмовы не безнадзейныя.

Апазіцыйныя лідэры пад шумок міждзяржаўных разборак навылучалі самі сябе, нарабілі заяў, але яркай, унушаючай давер стратэгіі пакуль ніхто не агучыў. Сілы партыі БНФ выглядаюць непераканаўча, маладыя выхадцы з таго ж лагеру пакуль сядзяць у падполлі і няведама чым маюцца, хрысціянскія дэмакраты нават людзей з моцнымі нервамі бянтэжаць канцэнтратам рэлігіі ў палітычнай дзейнасці. Кандыдат ад АГП, канешне, разумны чалавек, і спецыяліст някепскі, але ад сярэдняга выбаршчыка далекавата. Некаторыя асобы ціхенька пакрасавацца выйшлі, але, відавочна, гэтак жа і сыдуць. Хіба што рух Някляева «Гавары праўду!» за гэты час паднабраў сілаў і рэсурсаў, ды ад Мілінкевіча па інерцыі, за старыя заслугі, чакаюць рашэння ісці на выбары.

Эканоміка і цэнзура грамадска-палітычнай сферы — атланты і карыятыды дзейснага рэжыму. Выходзіць на маршы пустых каструляў пакуль няма нагоды, а пра альтэрнатыву не думаюць, бо поле агляду стэрыльнае. Першы складнік Расія акуратна апрабуе на трываласць цягам года, другі пачалі расхістваць летам, тым больш, што блізкасць інфармацыйных прастораў дае магчымасць для дзеянняў.

Выбары на канец гэтага года прадказалі задоўга да іх прызначэння, і прычына ўсё ў той жа эканоміцы: старыя кантракты яшчэ дзейнічаюць, новых энергетычных войнаў няма, газавы вентыль не перакрылі, кошты не ўзнялі. Ды і настрой пад Новы год харошы, пра палітыку думаць не хочацца. Але, як вядома, палітыка ў такім разе думае пра цябе, нездарма ўжо з'яўляюцца жарты пра навагоднія святы, праведзеныя «на сутках» за кратамі.




## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ЖУПРАНЫ. ПАМЯЦІ ПІСЬМЕННІКА

Завяршылася рэканструкцыя помніка і надмагілля пахавання Францішка Багушэвіча. Барэльеф на помніку застаўся той самы, што быў усталяваны ў 1975 годзе, а надмагільныя пліты і стэлы на магілах паэта і ягоных родных былі замененыя на новыя.

Рэканструкцыю выканала ЧПУП «Менком», якое ўзначальвае Юры Гурскі. Ён і ягоны калектыў выступілі спонсарамі гэтага праекта (12 мільёнаў беларускіх рублёў). Садзейнічанне ў рэканструкцыі помніка аказалі ААТ «Будаўнік» (Сазановіч А.А.), прадпрыемства меліярацыйных і водагаспадарчых сістэм (Альшук В.І.), ТАА «Граніт+» (Гугкала А.П.).

### СЛУЦК. ЗАЦІКАВІЛІ ЧЫТАЧОЎ ТАНЦАМІ

17 верасня ў раённай цэнтральнай бібліятэцы з паловы сёмай да адзінаццаці вечара прайшла «Ноч у бібліятэцы». Наведвальнікаў чакала сустрэча з пісьменніцай Наталляй Батраковай, выстава тэатра васковых фігур, кніжны кірмаш, выстава-продаж вырабаў народных майстроў, танцавальна-забаўляльная праграма. Акрамя гэтага ўсе ахвотныя змаглі бясплатна пракансультавацца ў юрыста і мелі вольны доступ да інтэрнэта.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

ПАМЯЦЬ

# БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНІНЫ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Адзінаццаць гадоў таму 16 верасня зніклі палітык Віктар Ганчар і бізнесмен Анатоль Красоўскі.**



На месцы, дзе стаяла машына апазіцыйнага палітыка, знайшлі асколкі шкла і сляды крыві на асфальце. З таго часу ніякіх звестак пра гэтых людзей, якія ў той вечар былі разам, так і не з'явілася. Як і інфармацыі пра лёсы скрадзенага экс-міністра ўнутраных спраў Юрыя Захаранкі і тэлеаператара Зміцера Завадскага.

Віктар Ганчар быў вельмі актыўным і перспектыўным палітыкам. І, як шмат хто лічыў, «персанальнай альтэрнатывай» Лукашэнку. Анатоль Красоўскі — паспяховы прадпрымальнік, які сябраваў з Ганчаром. Усе спробы родных і калег дамагчыся афіцыйнага расследавання гэтага злачынства аказаліся безвыніковымі.

Доўгія адзінаццаць гадоў улада дэманструе толькі адно — нежаданне ўзгадваць пра гучныя палітычныя справы. «І робіць усё, каб паралізаваць афіцыйнае следства, не дапусціць далейшага раскрыцця гэтых спраў, а тым больш прыцягнення вінаватых да адказнасці», — канстатуе прадстаўнік сямей зніклых Гары Паганяйла.

Па яго словах, справы зніклых апанентаў «з'яўляюцца сур'ёзнейшай стрэмкай у целе ўлады». Выкраданні і знікненні людзей, пазасудовыя смяротныя кары, да якіх датычныя высокія службовыя асобы дзяржавы, адносяцца да складу міжнародных злачынстваў супраць чалавецтва.

Спрыяльны вынік будзе тады, калі зменіцца ўлада, адзначыў Гары Паганяйла. «А пакуль незагойная крывавая рана будзе падштурхоўваць родных увесь час звяртацца і да нашай грамадскасці, і да міжнародных, каб прымусіць афіцыйныя структуры расследаваць гэтыя жахлівыя злачынствы і пакараць вінаватых», — заявіў праваабаронца.

АКЦЫЯ

# ВЯРНУЦЬ КАСЦЁЛ ВЕРНІКАМ

Генадзь КЕСНЕР

**Прадстаўнікі незарэгістраванай Партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» і зарэгістраванага ў Чэхіі Міжнароднага моладзевага аб'яднання «Малады фронт» 15 верасня перадалі ў дзяржаўныя ўстановы, а таксама ў пасольства Ватыкану ў Беларусі подпісы грамадзян, якія патрабуюць вярнуць вернікам касцёл Святога Язэпа, што знаходзіцца ў цэнтры Мінска.**

Як распавёў «НЧ» сустаршыня БХД Павел Севярынец, за тры апошнія тыдні было сабрана шэсць з паловай тысяч подпісаў. З іх паўтары тысячы перадаюцца ўладам праз касцёл у Гродзенскай вобласці, звыш тысячы подпісаў грамадзяне і касцельныя камітэты дасылаюць па пошце ў Адміністрацыю прэзідэнта, яшчэ чатыры тысячы подпісаў, сабраных непасрэдна ў Мінску, у першую чаргу перад сталічнымі касцёламі, былі перададзены непасрэдна ў дзяржаўныя структуры.

Лісты з подпісамі былі перададзены ў Апостальскую нунцыятуру (пасольства Ватыкана), дзе актывістаў прыняў амбасадар Святога Пасаду Яго Экселенцыя Марцін Відавіч. У аддзеле па зваротах грамадзян Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу подпісы прыняла супрацоўніца гэтага аддзелу Раіса Лабкоўская, а ў прэзідэнцкай адміністрацыі парламенцёраў прыняў кіраўнік аддзелу па сувязям з грамадскасцю і зваротам грамадзян Пётр Катушкін, з якім актывісты БХД і «Маладога фронту» мелі размову.

«Мы невыпадкова ладзім гэту кампанію менавіта падчас прэзідэнцкіх выбараў, бо сістэма ў Беларусі сёння ўладкавана такім чынам, што менавіта падчас электаральнай кампаніі можна чаго-небудзь дамагчыся, — адзначае Павел Севярынец. — Таму акурат цяпер мы перадаём гэтыя подпісы, а з 16 верасня штодзень у 19.00 мы збіраемся каля касцёла Святога Язэпа і праводзім акцыі ў абарону гэтага касцёла. Касцёл і кляштар плануюць пераабсталяваць пад гатэль. Гэта знакавы будынак, гэта храм у самым цэнтры гораду, і як беларусы, як хрысціяне, мы лічым, што там не месца для казіно, для забавак, там месца для храму. Гэта Плошча Свабоды, самае сэрца Мінска, проста сэрце месца».

Варта адзначыць, што гэта не першая спроба абараніць касцёл Святога Язэпа. Яшчэ ў 2007 годзе актывісты дэмакратычных сіл і вернікі перадалі ў Адміністрацыю прэзідэнта каля 30 тысяч подпісаў грамадзян пад зваротам вярнуць касцёл сталічным каталікам. У кляштарным комплексе з пачатку 2010 года вядуцца будаўнічыя працы, але сам будынак касцёла пакуль не кранаюць, бо там месціцца архіў.

МАНІТОРЫНГ

# СКЕПТЫЦЫЗМ ДЛЯ ЕС

Вольга ХВОІН

**Эксперты праваабарончых арганізацый, Беларускай асацыяцыі журналістаў, Асамблеі НДА прапануюць Еўрапейскаму саюзу перайсці да сістэмнай, прадказальнай і паслядоўнай працы з уладамі Беларусі.**

Апроч агульнага аналізу грамадска-палітычнай сітуацыі ў Беларусі цягам лістападу 2008 — верасня 2010 гадоў у падрыхтаваным маніторынгу змяшчаюцца рэкамендацыі па палітыцы ЕС у дачыненні да Беларусі і крытэры, паводле якіх можна ацэньваць прагрэс у краіне.

У кастрычніку 2008 года Савет Еўрапейскага саюза прыпыніў дзейнасць візавых санкцый супраць некалькіх высокіх беларускіх чыноўнікаў. Сёлета ў кастрычніку ЕС будзе пераглядаць сваё рашэнне і далейшыя адносіны з беларускім урадам.

Эксперты адзначаюць, што «пацяпленне» ў палітыцы Еўрасаюза было крокам наперад у стасунках з Беларуссю і паспрыяла пэўным «касметычным» паляпшэнням сітуацыі з правамі чалавека. «Сімвалічныя крокі беларускага ўраду ў бок лібералізацыі за першы год дыялогу далі падставу спадзявацца на далейшае паглыбленне і развіццё інстытутаў, заканадаўства і практык, скіраваных на паляпшэнне сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Але на працягу 2010 года сітуацыя значна пагоршылася, асабліва стан таго сегменту грамадзянскай супольнасці, які можа прымаць актыўны ўдзел у надыходзячай выбарчай кампаніі», — гаворыцца ў справаздачы.

Старшыня Беларускага Хельсінкскага камітэту Алег Гулак зазначае, што «сістэма застаецца несяброўскай, неспрыяльнай для грамадзянскай супольнасці, журналістаў», хаця «колькасць, яскравасць рэпрэсій зменшылася». Гулак мяркуе, што выправіць сітуацыю магчыма праз карэнную перабудову сістэмы: змену заканадаўства, канкрэтныя сігналы грамадству, чыноўніцтву, праз прыцягненне да адказнасці тых, хто вінаваты ў парушэнні правоў чалавека.

Грамадзянская супольнасць прапануе пяць рэкамендацый, якія мусяць садзейнічаць больш грунтоўным і паслядоўным зменам у двухбаковых палітычных адносінах.

Па-першае, не адмяняць візавыя санкцыі ў дачыненні да беларускіх чыноўнікаў, пакуль не будзе грунтоўнага прагрэсу ў паляпшэнні сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Узнаўленне санкцый у гэты момант пазбавіць ЕС уплыву на Беларусь.

Па-другое, прапануецца распрацаваць інструмент, які дазволіў бы больш эфектыўна прымяняць сістэму санкцый падчас і пасля выбарчай кампаніі — пашырэнне спісу вінаватых у парушэннях правоў чалавека, на якіх распаўсюджваюцца санкцыі, больш гнуткі працэс актуалізацыі спісу, абмежаванне кантактаў на вышэйшым узроўні.

Аўтары маніторынгу лічаць мэтазгодным падрыхтаваць даклад па сітуацыі ў Беларусі і ацаніць эфектыўнасць палітыкі ЕС за перыяд дыялогу па канкрэтных крытэрах, а таксама даць магчымасць грамадзянскай супольнасці зрабіць свой унёсак. З канкрэтнымі крытэрамі, дарэчы, пакуль не ўсё зразумела. На просьбу ацаніць па пяцібальнай шкале прагрэс па такіх паказчыках, як «смяротная кара», «свабода аб'яднанняў і сходаў», «свабода СМІ» ды іншыя, дакладны адказ Алег Гулак даў толькі па першым пункце і «смяротная кара не была адмененая, два прысуды былі выкананыя, тут усё зразумела».

Чыноўнікаў ЕС эксперты заклікаюць падчас прыняцця рашэнняў па эканамічным супрацоўніцтве, інвестыцыях і крэдытах зважаць на сітуацыю з парушэннямі правоў чалавека. Рэпрэсіўныя інстытуты (такія, як Міністэрства ўнутраных спраў, Камітэт дзяржаўнай бяспекі, пракуратура, мясцовыя выбарчыя камісіі, судовыя інстанцыі) не павінны атрымліваць падтрымку, якая дазволіла б ім пашырыць свае рэпрэсіўныя дзеянні. У той жа час, адэкватная дапамога беларускім уладам, скіраваная на адаптацыю і правядзенне рэформ, мусіць быць павялічаная.

«Фундаментальныя грамадзянскія і палітычныя правы ў краіне істотна абмяжоўваюцца. Пераслед грамадскіх актывістаў, недзяржаўных арганізацый, незалежных журналістаў і дэмакратычных палітыкаў, як падаецца, будзе нарастаць з набліжэннем прэзідэнцкіх выбараў, — прагназуюць аўтары маніторынгу. Ды заклікаюць «Еўрапейскі саюз улічыць непавагу беларускімі ўладамі дэмакратычных каштоўнасцяў, на якіх заснаваны ЕС, пры распрацоўцы стратэгіі ўзаемаадносін з краінай».

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ІДЭАЛАГІЧНАЯ ВАЙНА ЎВАХОДЗІЦЬ У НОВУЮ ФАЗУ




**Сяргей САЛАЎЁЎ**

**Чаму заўсёды перад значнымі палітычнымі падзеямі я ўзгадваю знакамітую фразу з рамана братоў Стругацкіх «Стажоры»: «Ідэалагічная вайна на Бамбергу ўваходзіць у новую фазу»? Напэўна, таму, што выбары — хутчэй барацьба за свядомасць людзей, за іх душы, а не толькі за «галасы электарату». Хто будзе найбольш пераканаўчы, хто здолее адваяваць свае галасы — той і пераможа. «Стабільнасць крыштальнага сасуда або рэформы», — такі зараз выбар.**

Выбары прэзідэнта Беларусі пройдуць 19 снежня 2010 года. Адпаведная пастанова прынятая 14 верасня Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу на пасяджэнні пазачарговай, пятай, сесіі. За прагаласавалі аднагалосна ўсе 108 дэпутатаў. Пытанне пра разгляд даты выбараў у Беларусі было ўнесена ў парадак дня пасяджэння сесіі ніжняй палаты парламента саветам палаты за некалькі хвілін да пачатку пленарнага пасяджэння.

Пасля абвяшчэння парламентам даты выбараў пра намер удзельнічаць у выбарчай кампаніі заявілі шэраг беларускіх палітыкаў, у прыватнасці старшыня ЛДП Сяргей Гайдукевіч, лідэр грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!» Уладзімір Някляеў, лідэр грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Андрэй Саннікаў, намеснік старшыні Партыі БНФ Рыгор Кастусёў, сустаршыня аргкамітэта па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» Віталь Рымашэўскі, намеснік старшыні Беларускай партыі «Зялёныя» Юрый Глушакоў, намеснік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі Яраслаў Раманчук, эканаміст Віктар Цярэшчанка.

Рашэнне пра фармат удзелу ў выбарах лідэра руху «За Свабоду» Аляксандра Мілінкевіча будзе абнародавана да канца тыдня.

Зразумела, не абыдзецца на гэтых выбарах і без дзейнага лідэра краіны — Аляксандра Лукашэнкі. Нягледзячы на тое, што некаторыя з патэнцыйных прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта не лічаць ягоны ўдзел у выбарах магчымым.

«Лукашэнка не мае ні маральнага, ні юрыдычнага права вылучаць сваю кандыдатуру на прэзідэнцкіх выбарах», — заявіў намеснік старшыні Партыі БНФ Рыгор Кастусёў. Палітык не бачыць юрыдычных падстаў лічыць легітымнымі рашэнні рэферэндуму 2004 года, якія дазваляюць абірацца прэзідэнтам адной асобе неабмежаваную колькасць разоў. «Шаснаццаць гадоў палітыкі гандлю нацыянальнымі інтарэсамі, якой кіруецца Лукашэнка, паставілі краіну ў літаральным сэнсе на мяжу існавання, — лічыць Кастусёў. — Яе працяг будзе азначаць вялікую рызыку страты беларускім народам дзяржаўнасці і пераўтварэнне нашай краіны ў прадмет каланіяльнай экспансіі».

Такім чынам, гэта першы ідэалагічны выклік Аляксандру Лукашэнку. Аднак наўрад ці ён будзе адзіным.

Тым больш, зараз беларуская ўлада знаходзіцца пад пільнай увагай Масквы. Яшчэ не паспелі заціхнуць усялякія «Хросныя бацькі» і адгалоскі атакі на расійскае пасольства ў Мінску, як прагучаў новы інфармацыйны выбух. Ананімны супрацоўнік расійскіх спецслужб паведаміў, што Пуцін настолькі раззлаваўся на Аляксандра Лукашэнку, што «заказаў» яго невядомым кілерам.

Аналітыкі адзначаюць, што замовы і замахі — звычайная тэма для прэзідэнта Лукашэнкі. Гэта стала ўжо звычкай, а не сенсацыяй. З 1994 года, з моманту «нападу пад Лёзна», нас пужалі ці то ўкраінскімі, ці то грузінскімі баевікамі, былы старшыня КДБ Сцяпан Сухарэнка «выкрыў» спробу атруціць мінскі водаправод дохлым пацуком у 2006-м. Нічога з гэтага не здзейснілася.

Няма сумневаў, што, каб Пуцін сапраўды раззлаваўся на Лукашэнку і загадаў бы яго «прыбраць», то Аляксандр Рыгоравіч не пражыў бы і тыдня. Тым больш, што беларускія спецслужбы вельмі шчыльна «нашпігаваныя» расіянамі. Так што гэта інфармацыйнае ўкідванне, верагодна, было зроблена з беларускага боку. А вось як да яго паставіцца Пуцін — гэта вялікае пытанне. Бо яго наўпрост абвінавацілі ў арганізацыі заказнога забойства, а такія абвінавачванні патрабуюць адказу.

Наўрад ці сваю пазіцыю адносна беларускіх выбараў зменіць і Еўропа. Еўрасаюз спадзяецца, што прэзідэнцкія выбары ў Беларусі пройдуць у адпаведнасці з еўрапейскімі і міжнароднымі стандартамі дэмакратычных выбараў. Пра гэта заявіла Мая Качыянчыч, прэс-сакратар вярхоўнага прадстаўніка ЕС па знешніх сувязях Кэтрын Эштан. Качыянчыч адзначыла, што БДІПЧ АБСЕ дало Беларусі шэраг рэкамендацый у гэтай сферы. Як спадзяецца ЕС, яны «будуць рэалізаваны перад выбарамі», бо заклікаваны забяспечыць роўныя ўмовы для ўсіх кандыдатаў.

То бок, Еўропа спадзяецца на выкананне патрабаванняў АБСЕ адносна правядзення празрыстых і дэмакратычных выбараў, якіх у Беларусі практычна ніколі не было. Спадзявацца на тое, што яны адбудуцца зараз, таксама не выпадае. Такім чынам, Беларусь апынулася ў аблозе і з Захаду, і з Усходу. Што будзе рабіць у гэтым выпадку ўлада — невядома, пэўна, нават ёй самой.

Тым не менш, не ўсё спакойна і ўнутры Беларусі. Генеральная пракуратура правярае версію аб забойстве і інсцэніроўцы самагубства журналіста Алега Бябеніна, паведаміў намеснік генеральнага пракурора Андрэй Швед 13 верасня на прэс-канферэнцыі для вузкага кола журналістаў. Фрагменты яго заявы былі паказаныя ў праграмах навін беларускіх тэлеканалаў.

«Намі правяраецца некалькі версій, — сказаў Швед. — Першая версія — гэта самагубства журналіста. Другая версія, адпаведна, — забойства і інсцэніроўка самагубства. Па выніках праведзеных праверачных і іншых мерапрыемстваў на сёння няма ніякіх даных, якія б ставілі пад сумненне асноўную версію: самагубства журналіста».

На гэтую акалічнасць, паводле слоў Шведа, указвае шэраг аб'ектыўных даных, матэрыялаў, апытанняў асоб і іншых акалічнасцяў, якія «даследуюцца і будуць правярацца ў далейшым». «Акрамя таго, і другая версія, звязаная з магчымым забойствам і інсцэніроўкай самагубства, намі, як я ўжо сказаў, з рахункаў не здымаецца. Мы працуем у поўным аб'ёме», — сказаў прадстаўнік Генпракуратуры. «Заяўляю: ніводная інфармацыя, якая з'яўляецца ў так званых апазіцыйных СМІ, звязаная з акалічнасцямі гібелі журналіста, на сённяшні дзень аб'ектыўна не пацвярджаецца», — заявіў Швед.

Такім чынам, пракуратура не выключае, што смерць Бябеніна — гэта забойства. Але, як паведамлялася раней, следчыя дзеянні не завершаныя. І якім будзе вынік экспертыз і следства, даведаемся прыкладна праз месяц.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### КАЦЯРЫНА КАРСТЭН



Шматразовая чэмпіёнка свету, двухразовая алімпійская чэмпіёнка Кацярына Карстэн заваявала золата на чэмпіянаце Еўропы па акадэмічным веславанні, што праходзіў у партугальскім Мантэморэ-о-Велью. Карстэн апярэдзіла сваю суперніцу Мірку Кнапкову з Чэхіі, якая стала другой, больш чым на 1 секунду. Шведка Фрыда Свенсан заняла 3-е месца. Чацвёртае месца на чэмпіянаце Еўропы па акадэмічным веславанні заняла жаночая двойка з Беларусі: Юлія Бічык і Таццяна Кухта адсталі ад пераможцаў на 5,61 секунды.

Яшчэ два беларускія экіпажы сталі пераможцамі чэмпіянату Еўропы. Жаночая чацвёрка без рулявога (Ганна Гаўра, Наталля Гелах, Наталля Гаўрыленка і Зінаіда Ключынская) амаль на 7 секунд апярэдзіла італьянскую лодку, якая была адзіным супернікам беларусак у фінале. Мужчынская двойка з рулявым (Вадзім Ляліна, Аляксандр Казубоўскі, Пётр Пятрыніч) больш чым на 3 секунды таксама апярэдзіла італьянцаў.

### ЛІДЗІЯ ЯРМОШЫНА



Photo.ByMedia.Net

Важнай фігурай тыдня стала старшыня Цэтрвыбаркама Лідзія Ярмошына. Яна — нязменны кіраўнік гэтай установы, галоўны «лічыльнік» галасоў беларусаў, арганізатар «элегантных перамог» і культавых 83% «за».

Лідзія Ярмошына паведаміла, што прэтэндэнты ў кандыдаты ў прэзідэнты павінны падаць заявы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп на працягу 10 дзён ад даты прызначэння выбараў, то бок не пазней 24 верасня. На працягу 5 дзён пасля гэтага Цэнтрвыбаркам мусіць прыняць рашэнне з нагоды рэгістрацыі ініцыятыўных груп.

Кіраўніца Цэнтрвыбаркама паабяцала зрабіць гэту палітычную кампанію «вясёлай»: «Мы будзем рэгістраваць усіх, паверце. За вушы будзем цягнуць! Таму што зацікаўленыя ў тым, каб выбары былі вясёлыя, актыўныя. Але асноўная праблема са зборам подпісаў. На жаль, пачынаючы з 2001 года больш чатырох прэтэндэнтаў 100 тысяч подпісаў не збіраюць. Усе астатнія прэтэндэнты не ў стане вытрымаць стотысячную норму».

Такім чынам, імёны прэтэндэнтаў на прэзідэнцкі фатэль стануць вядомыя да 30 верасня. І ад гэтай даты можа пачацца збор подпісаў за кандыдатаў у прэзідэнты. Бліжэйшым часам Міністэрства замежных спраў накіруе запрашэнні ў міжнародныя арганізацыі, якія займаюцца назіраннем за выбарамі.

### ДАНІІЛ КАЗЛОЎ



Дзіцячае Еўрабачанне сёлета ў першыню пройдзе ў Беларусі. Краіна ўжо вызначылася са сваім прадстаўніком. Данііл Казлоў са шматдзетнай сям'і евангельскіх баптыстаў з песняй «Музыкі святло» ў лістападзе будзе змагацца за перамогу ў прэстыжным конкурсе.

Пасля абвяшчэння вынікаў адборачнага конкурсу Данііл прызнаўся, што падчас свайго выступу сыходзіў у поўны адрыў, нічога не адчуваючы. «Я прысвячаю сваю перамогу ўсім сваім родным і Богу, — цытуе юнага артыста «Камсамольская праўда». — Я спадзяваўся выйграць, хоць і прайграў сваёй аднакласніцы па музычнай школе цэлую жуйку. Да эфіру мы з ёй паспрачаліся: яна сказала, што я выйграю, а я не вельмі верыў у гэта! Зараз вось адчуваю адказнасць, бо я ж прадстаўляю Беларусь!»

Даніілу 13 гадоў, але ён ужо мае шэраг творчых перамог: уладальнік Гран-пры міжнароднага конкурсу «Залатая пчолка» ў 2009 годзе, лаўрэат міжнароднага конкурсу краін Балтыі і СНД, пераможца рэспубліканскага конкурсу «Юныя таленты Беларусі» ў лагеры «Зубраня», дыпламант адмысловага фонду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за развіццё таленавітай моладзі.

Кампазітар, прадзюсер Валер Галаўко мяркуе, што ў Данііла Казлова «каласальны вакальны патэнцыял». «Крытэры перамогі на дзіцячым «Еўрабачанні» былі мне невядомыя ўчора, застаюцца невядомыя сёння і будуць невядомыя заўтра. Таму я слаба ўяўляю, чаго можна чакаць ад песні «Музыкі святло», падрыхтаванай Даніілам. Магу толькі сказаць, чаго можна чакаць ад самога хлопчыка. Упэўнены, сорамна за яго не будзе. У хлопца выдатныя вакальныя дадзеныя, і я прадракаю яму вялікую будучыню пры ўмове, што з ім будуць працаваць годныя людзі, якія гатовыя весці яго да сусветных прастораў і ствараць для артыста добры рэпертуар. Калі меркаваць па каласальным вакальным патэнцыяле Данііла, то з яго можна зрабіць зорку сусветнага ўзроўню», — зазначае кампазітар.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# БОЙ З БЮРАКРАТЫЧНЫМ ЦЕНЕМ

Сяргей НІКАЛЮК

**У цывілізаваных краінах грамадства ад бюракратызму абараняе палітычная сістэма. У Беларусі — адзін палітык. Ці варта пасля гэтага дзівіцца, што наша бюракратыя круцейшая.**



1 верасня на павестку дня зноў было пастаўлена пытанне пра барацьбу з бюракратызмам, *«этой страшной бедой любого общества»*. Чаму зноў? Бо *«о дебюрократизации мы говорим три года»*. І вось надышоў час перайсці ад слоў да справы, і ажыццяўляцца гэта справа *«будет публично»*. Такое вось нацыянальнае ноў-хаў. Тут варта нагадаць, што пад звон бакалаў з навагоднім шампанскім Улада тры гады таму ўзяла на сябе вельмі пэўнае абавязанне: *«В следующем году должен быть окончательно завершён процесс дебюрократизации. Это своего рода экзамен для всех органов власти»*.

Здаць экзамен, аднак, у *«органов»* не атрымалася. Нічога дзіўнага ў гэтым няма. Экзамен па дэбюракратызацыі — адзін з самых складаных. Далёка не ўсе егіпецкія фараоны здолелі здаць яго з першага разу. А колькі апранутых у парфіру гаротнікаў было адлічана дэканатамі! Гісторыя поўніцца сумнымі прыкладамі расстання са службовымі тронамі з-за «нездавальняючай» адзнакі па дэбюракратызацыі.

## Бюракратычны біяцэноз

Слова «бюракратыя» ўвёў у 1745 годзе французскі мысляр дэ Гурнэ. Ён дадаў да слова «бюро» (што азначала як установу, так і пісьмовы стол) частку, якая паходзіла ад грэчаскага дзеяслова «кіраваць». «Бюракратыя», такім чынам, азначае ўладу чыноўнікаў, а «дэбюракратызацыя», адпаведна, — барацьба з уладай чыноўнікаў.

З 1 верасня гэта змаганне ў Беларусі будзе весціся *«очень жестко и даже жестоко»*. Неабходных распараджэнні на гэты конт кіраўнік дзяржавы перадаў. Вы спытаеце, каму? Адказ відавочны. Усе цяжкасці і нягоды барацьбы з уладай чыноўнікаў вырашана ўскласці на плечы саміх чыноўнікаў. Ва ўмовах бюджэтнага дэфіцыту, які ўвесь час нарастае, рашэнне, адразу скажам, правільнае. Навошта прыцягваць «шырокую грамадскасць»? Бескарыслівыя грамадзяне даўно перавяліся. Таму хай кожны бюракрат самастойна зробіць сцяг дэбюракратызацыі і пашые яго непасрэдна на сваім працоўным месцы. Памер сцяга варта прывязаць да памеру акладу. Чым вышэйшы аклад — тым большая плошча сцягу. Барацьба барацьбой, а парушаць прынцып сацыяльнай справядлівасці ў нас нікому не дазволена.

Пярэчанняў наконт дадатковага пункту ў спісе функцыянальных абавязкаў з боку бюракратыі, натуральна, не паступіла. Усе дружна ўзялі пад казырок, дэманструючы тым самым сваю гатоўнасць неадкладна прыступіць да знішчэння бюракратызму. Такая гатоўнасць выцякае з самой прыроды бюракратыі. Галоўнае, каб праблема вырашалася выключна бюракратычным шляхам, г. зн. праз удасканаленне нарматыўнай базы, стварэнне разнастайных камісій і працоўных груп.

Да такой дзейнасці бюракратыя, нібы юны піянер, *«всегда готова»*. Яна згодна падвысіць сярэднюю зарплату да 500 долараў; стварыць спрыяльныя ўмовы для прыцягнення замежных інвестыцый; знізіць энергаёмістасць; нават заараць салому, падвышаючы тым самым канцэнтрацыю перагною ў глебе. Бюракратыя гатовая змагацца з бюракратызмам да поўнага знішчэння бюракратыі. І калі момант канчатковай перамогі надыдзе, дык нечакана высветліцца, што адзіным рэальным вынікам барацьбы будзе ўмацаванне бюракратыі.

У гэтай сувязі эканаміст Алег Грыгор'еў прапануе разглядаць бюракратыю як біялагічную сістэму (біяцэноз). Дам яму слова: «Якая мэта біяцэнозу? Пашырацца, займаючы ўвесь арэал свайго існавання, па магчымасці, захопліваць новыя тэрыторыі і нарошчваць, нарошчваць і яшчэ раз нарошчваць біямасу. Тая акалічнасць, што ў рамках біяцэнозу адбываецца ўнутрывідавая і міжвідавая барацьба, зусім не адмаўляе наяўнасці адзінай мэты біяцэнозу. Наадварот, гэта мэта дасягаецца толькі падчас і ў выніку такой барацьбы. Але і бюракратыя дасягае сваёй мэты толькі падчас жорсткай унутранай барацьбы ўсіх супраць усіх».

## Хто з'еў нашу бульбу?

Класік сацыялогіі Макс Вебер у пачатку мінулага стагоддзя распрацаваў канцэпцыю рацыянальнай бюракратыі. У гэтай канцэпцыі ёсць сур'ёзны недахоп: рацыянальнай бюракратыі нідзе і ніхто так і не здолеў адшукаць. У рамках канцэпцыі Вебера бюракратыя павінна лаяльна і кампетэнтна выконваць рашэнні па дасягненні мэтаў, указаных палітыкамі. Самім жа бюракратам усё адно, чаго дасягаць. Для іх галоўнае — працэс. Прадастаўленыя самі сабе, яны рухаюцца туды, куды рухацца лягчэй, і запаўняюць сабой усю вольную прастору.

Як адзначаў ужо знаёмы нам па папярэдніх «Азбуках паліталогіі» Ральф Дарэндорф, «бюракратыя можа панаваць, але не кіраваць». Аднак не ўсё так проста. Палітыкі прымаюць абавязковыя для выканання рашэнні, якія грунтуюцца на інфармацыі, сабранай і адсартаванай… бюракратамі. А хто валодае інфармацыяй, той і валодае светам.



Беларусі Бог даў толькі аднаго палітыка. Усе астатнія, уключаючы прэм'ер-міністра, — бюракраты. Такая спрошчаная канструкцыя істотна зніжае эфектыўнасць кіравання. Па-першае, таму што правам на вызначэнне мэтаў валодае толькі адзін чалавек. І гэта на 9,4 мільёна насельніцтва! Па-другое, не варта забываць пра разнастайнасць кірункаў, па якіх сёння прымаюцца рашэнні на вяршыні ўладнай піраміды. У тым, што кіраўнік дзяржавы разбіраецца ў перагноі, сумнявацца не даводзіцца. Як прафесійны гісторык, ён цвёрда ведае, што беларуская зямля і беларускі народ *«никогда танки на Москву не пропускали»*. Але наколькі ён кампетэнтны ў пытаннях аўтсорсінгу і мерчэндайзінгу? Дзе гарантыя, што з-за інфармацыі, якую падаюць ангажаваныя чыноўнікі, беларускі аўтсорсінг не падзеліць лёс кібернетыкі, а мерчэндайзінг — генетыкі?

Але і з сельскай гаспадаркай не ўсё так проста. Звернемся да афіцыйнай статыстыкі, падрыхтаванай, зразумела, бюракратамі. У рэспубліцы летась было сабрана 8 мільёнаў тон бульбы. 30 тысяч (!) — экспартавана, 970 тысяч — скормлена быдлу і 1,8 мільёна — з'едзена насельніцтвам. А дзе астатняя? Гэта не мае пытанне, гэта пытанне карэспандэнта «Советской Белоруссии» Алены Слаў. Пытанне ёсць. Адказу няма.

Калі правесці нескладанае арыфметычнае дзеянне, мы атрымаем у «сухім» астатку 5,2 мільёна тон паўнаважкіх бульбяных клубняў (65% ад сабранага ўраджаю). Сёлета з-за засухі наш усходні сусед плануе закупіць 4 мільёна тон «другога хлеба». Як нядаўна высветлілася, рэнтабельнасць экспарту бульбы — ад 60 да 100 працэнтаў. Здавалася б, валюту ў літаральным сэнсе можна грэбці лапатай. Але *«более 100 тысяч тонн без ущерба для собственного рынка белорусские хозяйства продать за рубеж не смогут»* (крыніца ўсё тая ж — «Советская Белоруссия»).

## Дэвальвацыя Карацупы

Прыведзены прыклад падводзіць нас да праблемы адказнасці. Паводле галоўнага закона бюракратыі, адказнасць варта перадаць палітыкам (палітыку), сабе ж пакінуць паўнамоцтвы. На самым версе гэта разумеюць. Адсюль і чарговая кампанія, накіраваная супраць бюракратычнага біяцэнозу, які распладзіўся. У свой час Сталін стрымліваў яго рост вельмі простым, аднак тым не менш эфектыўным спосабам. Пазней ён атрымаў назву «Вялікі тэрор».

Скарыстацца сталінскімі напрацоўкамі сёння не ўяўляецца магчымым. Час на дварэ не той. Ад заходняга досведу таксама мала карысці. Прыцягненне да кантролю грамадства азначала б пераход да рэальнай дэмакратыі з яе непазбежнай палітычнай канкурэнцыяй. Для адзінага беларускага палітыка *«оба варианта хуже»*. З такой адзнакай альтэрнатыўных магчымасцяў, запазычанай у «лепшага сябра савецкіх чыгуначнікаў», цяжка не пагадзіцца.

Вось і атрымліваецца тое, што атрымліваецца. Пад кананаду пагроз бюракратычны Васька слухае, але працягвае есці. Усё лагічна. Як заўважыў гісторык Андрэй Фурсаў: «Калі служба — галоўны фактар, які вызначае быццё і быт пануючых груп, то непазбежны пастаянны прырост колькасці служылага люду». Любыя ж спробы абмежаваць рост бюракратычнага біяцэнозу будуць прыводзіць да зваротнага выніку.

У час майго дзяцінства хлопчыкі марылі служыць на мяжы і, як легендарны Карацупа, затрымліваць *«засланных казачков»*. Пасля 12 красавіка 1961 года самай прэстыжнай працай стала прафесія касманаўта. Сёння па-за конкурсам — дзяржаўныя чыноўнікі. Як сказаў выпускнік адной гімназіі: «Значна цікавей быць тым, каму даюць, чым тым, хто дае». Пры ўсёй цынічнасці фармулёўкі ў мяне няма аргументаў, каб запярэчыць маладому чалавеку па сутнасці.

## Галасаванне дзвюма рукамі

У палітычных сістэмах з адзіным палітыкам праблема кантролю дакладнасці інфармацыі, якая паступае з бюракратычнай сістэмы, робіцца невырашальнай. Усё, што можа дазволіць сабе адзіны палітык, — стварыць паралельную бюракратычную сістэму. Але паколькі прынцып скажэння інфармацыі ад такой інавацыі не знікае, то аўчынка выгады не перакрывае матэрыяльных выдаткаў. Да таго ж, як лёгка заўважыць, дубляванне толькі паскарае рост масы бюракратычнага біяцэнозу.

Створаная для рэалізацыі палітычных мэтаў, бюракратыя з механізму пачынае ператварацца ў суб'ект палітыкі. І што важна, у суб'ект, які пазбаўлены палітычнай адказнасці. Так фармуецца класічная сітуацыя, пры якой світа робіць караля. І не істотна, што «кароль» атрымаў свой «скіпетр» не па спадчыне, а праз працэдуру ўсенароднага галасавання. Народ пры гэтым можа лічыць, што ўсенародна абраны абараняе іх ад бюракратыі, на самай справе ён абараняе бюракратыю ад народа.

Інтарэсы бюракратыі, як ужо адзначалася, прынцыпова нічым не адрозніваюцца ад «інтарэсаў» любога біяцэнозу. Бюракраты хочуць жыць, і жыць з кожным днём усё лепш. Падобныя мэты не могуць быць заяўленыя публічна ў якасці дзяржаўных, тым больш агульнанародных. Вось і даводзіцца адзінаму палітыку круціцца вужакай на патэльні, вінавацячы публічна бюракратыю ва ўсіх смяротных грахах. Але што прапануецца наўзамен? Наўзамен прапануецца *«внести нормативные акты — законы, указы, декреты Президента, распоряжения, постановления Правительства, чтобы мы однозначно могли «раскрепостить» человека»*. За такую адназначнасць прагаласуе любы бюракрат, прычым дзвюма рукамі.

ПЕРАПІС

# ДЭМАГРАФІЧНАЕ ПАДЗЕННЕ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Пасля абвяшчэння вынікаў перапісу насельніцтва некаторыя аналітыкі ўжо назвалі сітуацыю крытычнай для Беларусі. Усяго за дзесяць гадоў колькасць жыхароў краіны зменшылася на 541 тысячу чалавек (на 5,4%). Дзяцей у структуры насельніцтва стала меней на 620 тысяч чалавек (на 30%). Такія дадзеныя агучыў на мінулым тыдні Нацыянальны статыстычны камітэт.**




**Працэнт жыхароў насельнікаў Беларусі, якія прызнаюць беларускую мову роднай, паводле дадзеных дзевяці перапісаў (* У межах Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай, Віленскай, Гродзенскай губерняў. ** У межах БССР да верасня 1939 г.)**

## Меней 10 мільёнаў...

Пачатак новага стагоддзя адзначыўся для беларусаў дэмаграфічным падзеннем з 10-мільённага рубяжа. Па стане на кастрычнік 2009 года, калі адбываўся перапіс, колькасць насельніцтва ў Беларусі склала 9 мільёнаў 503,8 тысячы чалавек. А калі ўлічыць, што гэта было год таму, ад гэтай лічбы можна адняць яшчэ 50 тысяч. Менавіта на столькі штогод скарачаецца колькасць жыхароў у краіне. І спыніць гэта падзенне пакуль не ўяўляецца магчымым.

Статысты таксама заявілі, што для нашай краіны «характэрны высокі ўзровень урбанізацыі насельніцтва». Але не акцэнтавалі, што гэты працэс адбываецца за кошт заняпаду сельскіх мястэчак. Разам з тым ідзе канцэнтрацыя насельніцтва ў сталіцы і абласных цэнтрах. У мінулым годзе там пражывала 52% насельніцтва. Колькасць жыхароў Мінска за дзесяцігоддзе ўзрасла на 156 тысяч чалавек (на 9,3%) і на момант перапісу дасягнула 1 мільёна 837 тысяч чалавек. Усяго ж у Беларусі доля гараджан павялічылася з 69 да 74% і склала 7 мільёнаў 65 тысяч чалавек. А ў сельскай мясцовасці пражывалі 2 мільёны 439 тысяч чалавек (26%).

## Дэмаграфічная нагрузка

«Для Беларусі характэрны працэс старэння насельніцтва», — адзначылі спецыялісты статыстычнага камітэту. Колькасць жыхароў, старэй працаздольнага ўзросту, склала 22,5% насельніцтва (2 мільёны 139 тысяч). А працаздольнага ўзросту — 62% (5 мільёнаў 853 тысячы).

На момант перапісу насельніцтва на тысячу чалавек у працаздольным узросце прыходзілася 624 чалавекі ў непрацаздольным (у тым ліку і дзеці). Але і тут няма падставы для аптымізму. Бо ў Беларусі з-за падзення нараджальнасці скарацілася колькасць дзяцей, якія ў будучыні маглі б папоўніць шэрагі працаўнікоў. Напрыклад, у 1970 годзе на тысячу чалавек у працаздольным узросце прыпадала 586 дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў (у 1979-м — 429 дзяцей, у 1989-м — 437 і ў 1999-м — 371). А ў 2009 годзе — усяго 258 дзяцей.

Таму некаторыя аналітыкі ўжо прагназуюць, што Беларусь чакае непазбежнае павелічэнне пенсійнага ўзросту. І размовы пра гэта, якія час ад часу заводзяцца ў афіцыйных кулуарах, увасобяцца ў жыцці. Прычым у недалёкім часе — пасля прэзідэнцкіх выбараў.

## Дысбаланс палоў

Суадносіны жанчын і мужчын аб'ектыўна склаліся не на карысць апошніх. Спецыялісты канстатуюць высокі тэмп росту смяротнасці сярод мужчын (асабліва ў працаздольным узросце). Па стане на кастрычнік мінулага года ў краіне пражывала 4 мільёны 420 тысяч мужчын і 5 мільёнаў 84 тысячы жанчын. На тысячу мужчын прыпадае 1 150 жанчын. У параўнанні з 1999 годам колькасць мужчын скарацілася на 6,3%, а жанчын — на 4,6%. З-за высокай смяротнасці мужчын павялічылася колькасць удоваў — на 5,4% (на 42 тысячы). Іх доля сярод жанчын склала 18% (болей 810 тысяч).

Узрасла таксама колькасць разведзеных жанчын — на 17% (на 63 тысячы). У агульнай колькасці жаночага насельніцтва іх доля склала 10% (436 тысяч). Больш за палову з такіх жанчын — у дзетародным узросце.

Шлюбаў у Беларусі фіксуецца меней (на 4%), чым 10 гадоў таму. Афіцыйна зарэгістравалі свае адносіны 52% жанчын і 62% мужчын (адлік ад 15 гадоў і старэй). Доля сямейных параў, шлюб якіх не аформлены, павялічылася з 5 да 8%. Паказчык бясшлюбнасці для абодвух палоў не перавышае 4%. Менавіта столькі сярод мужчын і жанчын (50 гадоў і старэй) тых, хто ніколі не ўступаў у шлюб.

## Рост кітайцаў — у 20 разоў

За апошнія гады скарацілася і колькасць прадстаўнікоў найбольш шматлікіх нацыянальнасцяў. Напрыклад, колькасць яўрэяў (13 тысяч) зменшылася ў 2,2 разы, украінцаў (159 тысяч) і рускіх (785 тысяч) — на трэць. Палякаў (295 тысяч) стала меней на 25,6%. І звязана гэта як з натуральным змяншэннем насельніцтва, так і з міграцыйным адтокам.

Адначасова міграцыйныя працэсы прывялі да росту колькасці прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў, і яго тэмпы вымяраюцца ў разах. Так, кітайцаў, якія пастаянна пражываць на тэрыторыі Беларусі, стала больш чым у 20 разоў. Арабаў — у 2,7 разы, туркмен — у 2,3 разы. Аднак пакуль іх частка, як паведамілі статысты, у агульнай колькасці насельніцтва нязначная.

Вынікі перапісу засведчылі рост узроўню адукацыі жыхароў. Доля тых, хто атрымаў вышэйшую адукацыю, за дзесяцігоддзе вырасла з 14% (1 мільён 134 тысячы) да 19% (1 мільён 531 тысяча). А колькасць грамадзян, якія маюць сярэднюю спецыяльную (2 мільёны 190 тысяч) і прафесійна-тэхнічную адукацыю (898 тысяч) павялічылася на 21,2%.

## Русіфікацыя

Частка тых людзей, якія назвалі сябе беларусамі, павялічылася на 2,5 працэнта. Гэта паказчык склаў 83,7% (7 мільёнаў 957 тысяч). Але стаўленне да беларускай мовы, якое было агучана статыстычным камітэтам, шмат для каго стала нечаканым. Бо яе назвалі роднай мовай толькі 53,2% жыхароў краіны. Тады як усяго дзесяць гадоў таму гэты паказчык быў 73,7%. Скараціўся і працэнт людзей, якія ўжываюць беларускую мову дома, — з 36,7 да 23,4%.

Сярод беларусаў па нацыянальнасці гэтыя лічбы вышэй. Беларускую мову назвалі роднай 60,8%, а размаўляюць на ёй дома 26% беларусаў. Зніжэнне моўнага паказчыка аналітыкі тлумачаць русіфікацыяй, у тым ліку ў сферы адукацыі, СМІ і на ўзроўні дзяржаўных ведамстваў. І таксама фармулёўкай падчас перапісу паняцця роднай мовы як «мовы, засвоенай першай у раннім дзяцінстве».

А колькасць насельніцтва, якое свабодна валодае замежнымі мовамі, узрасла. Напрыклад, на англійскай мове свабодна размаўляюць 450 тысяч чалавек (у 3,2 разы болей, чым у 1999-м). Колькасць людзей, якія свабодна валодаюць нямецкай мовай, павялічылася ў 2,2 разы і складае каля 138 тысяч чалавек.

**РАЗМЕРКАВАННЕ НАСЕЛЬНІЦТВА ПА ВАЛОДАННЮ БЕЛАРУСКАЙ І РАСІЙСКАЙ МОВАМІ ПА РЭГІЁНАХ БЕЛАРУСІ (У ТЫС. ЧАЛАВЕК)**

| | Усё насельніцтва | З агульнай колькасці насельніцтва назвалі ў якасці | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | роднай мовы | | мовы, на якой звычайна азмаўляюць у хаце | |
| | | беларуская | расійская | беларуская | расійская |
| Рэспубліка Беларусь | 9503,8 | 5058,4 | 3948,1 | 2227,2 | 6673,0 |
| Брэсцкая | 1401,2 | 751,9 | 597,4 | 374,2 | 982,4 |
| Віцебская | 1230,8 | 646,8 | 543,7 | 276,1 | 900,8 |
| Гомельская | 1440,7 | 786,4 | 602,8 | 326,4 | 1037,6 |
| Гродзенская | 1072,4 | 634,7 | 386,9 | 375,9 | 606,1 |
| Мінск | 1836,8 | 645,9 | 966,0 | 106,1 | 1508,7 |
| Мінская | 1442,5 | 987,2 | 390,5 | 553,0 | 796,6 |
| Магілёўская | 1009,4 | 605,5 | 460,8 | 215,5 | 840,8 |

КАМЕНТАР

# КАТАСТРАФІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ

**Вынікі перапісу каментуе аналітык Валянцін Мацкевіч.**



— Гэта нацыянальная дэмаграфічная катастрофа. Штогод насельніцтва скарачаецца на 50 тысяч чалавек. Але далей нас чакае скачок уніз і яшчэ большае памяншэнне нараджальнасці. Гэта адбудзецца літаральна ў бліжэйшыя 5 гадоў. На змену прыйдзе пакаленне, якое нарадзілася ў сярэдзіне 90-х, калі адзначаўся спад нараджальнасці. Пачнецца рэзкі крэн у бок скарачэння насельніцтва. Гэты працэс называецца «дэмаграфічная яма».

Лічбы кажуць самі за сябе. Усё астатняе — прапаганда. Прыгожыя словы па тэлевізары. Так, прымаюцца розныя праграмы накшталт дэмаграфічнай бяспекі. Але праграма сама па сабе не працуе. І заклінанні не дзейнічаюць. Усе прыгожыя праграмы разбіваюцца аб рэальныя лічбы. Яны паказваюць, што мы знаходзімся на мяжы бездані.

У чым заключаецца мэта ўраду і прэзідэнта? Усе магчымыя фінансавыя сродкі павінны быць накіраваныя на тое, каб маладыя сем'і адбыліся, нарадзілі дзяцей, каб захоўваўся і развіваўся народ. У дзяржавы няма іншай мэты. Выдаткі на войска ці на спецслужбы — не гэта мэта. Усе хочуць мець сям'ю, дзяцей. Што для сям'і трэба? Зразумець не цяжка. Гэта ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Стабільная і годная праца. Жыллё. І калі ўладамі не будуць зроблены пэўныя захады, то праз 40 гадоў нас не 7,5 мільёнаў будзе (гэта па аптымістычных прагнозах), а значна меней.

Па моўным пытанні, вядома, быў ціск. Я зведаў гэта на асабістым прыкладзе. Да мяне прыйшлі з перапісам студэнты, хлопец з дзяўчынай. Хлопец пачаў размаўляць па-руску. Я папрасіў: «Калі ласка, размаўляйце па-беларуску». Калі падышлі да пытання пра мову, пачалося: «Не, родная мова тая, якую вы засвоілі першай у дзяцінстве». Я кажу: «Мая родная мова — беларуская, і запісвайце так, калі ласка». Нервовая сітуацыя была. Яны не маглі мяне нічым пераканаць. Але больш падатлівых, напэўна, пераканалі.

Я не ўпэўнены, што гэта фармулёўка нарадзілася ў камітэце статыстыкі. Яна нарадзілася толькі ў русафобаў, значна вышэй рангам. Яе ўціснулі ў перапісны ліст, бо ставілі пэўную мэту. І яны дамагліся гэтай мэты.

РАЗВАЖАННІ

# БЕСПРАЦОЎЕ ПА-БЕЛАРУСКУ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Многія назіральнікі даўно звярнулі ўвагу на надзвычай нізкія паказчыкі зарэгістраванага беспрацоўя ў Беларусі. Нават зараз, калі эканоміка яшчэ відавочна не аправілася ад крызісу, узровень беспрацоўя апусціўся ніжэй за 1 працэнт ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва, а ў Мінску — амаль да нуля. Гэта настолькі супярэчыць высновам падручнікаў па эканоміцы, што патрабуе спецыяльных тлумачэнняў.**




Photo.ByMedia.Net

Гадоў сорак таму тэлебачанне паказвала сюжэт пра няўдзячны лёс італьянскіх беспрацоўных. Там камунальная служба зладзіла спаборніцтва паміж прэтэндэнтамі заняць працоўныя месцы прыбіральшчыкаў. І вось дзея — удзельнікі са скрынямі для смецця ў руках нясуцца да велізарнага кантэйнера, каб у ліку першых высыпаць у яго свой друз. Такім вось чынам савецкая прапаганда спрабавала напячы аладак з усім вядомай сітуацыі. У іх беспрацоўе, у нас — на кожным кроку аб'явы: «Патрабуюцца, патрабуюцца, патрабуюцца...» Што праўда, прапаноў у нас было многа, але выбіраць асабліва не даводзілася — заробкі ва ўсіх былі амаль аднолькава невялікія. Таму зваротным бокам медаля, сапраўдным бізуном кадравых службаў была высокая цякучасць кадраў.

Зразумела, праблема беспрацоўя на Захадзе існавала. Але неяк у букіністычнай краме трапілася выдадзеная ў ФРГ кніжка пра беспрацоўнага, дзе гэта з'ява разглядалася хутчэй з псіхалагічнага, чым эканамічнага пункту гледжання. Каротка пра сюжэт. Гюнтэр працаваў на машынабудаўнічым прадпрыемстве звычайным токарам. Атрымліваў годны заробак і адчуваў сябе сапраўдным бацькам і мужам, паважаным грамадзянінам сваёй краіны. Але на прадпрыемстве правялі тэхналагічную рэканструкцыю, станкі памянялі на гнуткія апрацоўчыя цэнтры, таму Гюнтэра і шматлікіх яго калег звольнілі з працы. Паколькі ён меў працяглы працоўны стаж, быў сябрам прафесійнага саюза, рэгулярна плаціў унёскі ў фонд сацыяльнага страхавання, то памер дапамогі па змушанаму беспрацоўю аказаўся прыкладна такім жа, як і былы заробак.

Але як сказаць жонцы, як патлумачыць дзецям, што бацька страціў працоўнае месца? Таму Гюнтэр кожную раніцу з'язджаў з дому і вяртаўся дахаты толькі пасля заканчэння рабочага дня.

Аднак жонка здагадалася і, як і кожная разумная жанчына, зрабіла ўсё магчымае, каб супакоіць мужа. Далей, як кажуць, хэпі-энд. Хоць Гюнтэр не адразу знайшоў працу, але сям'я не галадала, і дзеці па-ранейшаму ганарыліся сваім бацькам.

Як вядома, ФРГ з'яўляецца краінай з рынкавай, сацыяльна скіраванай эканомікай. Прыярытэт тут аддаецца рынку, бо ён забяспечвае самаразвіццё гаспадаркі. Як лічыў аўтар нямецкага эканамічнага цуда Людвіг Эрхард, значна лягчэй дзяліць на ўсіх па справядлівасці, адразаючы ад пірага, які пастаянна павялічваецца, чым па картках размяркоўваць апошні мех сухароў.

***

У нас нават у Канстытуцыі сказана пра сацыяльную скіраванасць эканомікі і справядлівасць, а што на самай справе? Калі б Гюнтэр жыў у сучаснай Беларусі і страціў працу, то не толькі яго сям'я, але і сам ён трапіў бы ў натуральную галечу, колькі б часу да гэтага і як бы плённа ні працаваў. У студзені 2009 года сярэдні памер дапамогі па беспрацоўю складаў 47,6 тысячы рублёў, а летась у ліпені — 50,4 тысячы рублёў, або 18,4% ад кошту бюджэту пражытачнага мінімуму.

Калі нехта пачыне крытыкаваць мізэрнасць гэтых самых мінімумаў, Міністэрства працы адказвае, што яны маюць толькі статыстычнае значэнне, выкарыстоўваюцца ў якасці крытэру ацэнкі поспехаў дзяржавы ў барацьбе з беднасцю. Маўляў, калі сума прыбытку перавышае кошт мінімуму (270 тысяч рублёў), то чалавек ужо афіцыйна лічыцца хоць і не багатым, але ўжо і не бедным, і таму выключаецца з ліку прэтэндэнтаў на атрыманне адраснай дзяржаўнай дапамогі. Памятаеце, як у 2007 годзе ўлады дзеля бездакорнай арганізацыі сістэмы сацыяльнай дапамогі скасавалі амаль што ўсе віды льгот, якімі да таго часу карысталіся пенсіянеры, студэнты ды іншыя.

Дык вось, калі ацэньваць па мінімуму, то Беларусь з'яўляецца безумоўным сусветным лідэрам у барацьбе з беднасцю. Прыкладам, лацінаамерыканскія краіны дзесяцігоддзямі не могуць зрушыцца з месца — колькасць беднякоў застаецца стабільна высокай, нягледзячы на даволі хуткі рост іх эканомік. Больш таго, зараз адносная колькасць беднякоў у Беларусі ў структуры насельніцтва нават меншая, чым у Злучаных Штатах. Як сведчыць афіцыйная статыстыка, у 2000 годзе, калі прэзідэнт толькі ўздымаў лозунг «За сільную и процветающую Беларусь», — здабыткі ніжэй бюджэту пражытачнага мінімуму (рысы беднасці) мелі 41,9% насельніцтва, праз пяць гадоў — толькі 12,7%, а зараз (дадзеныя абследавання хатніх гаспадарак за студзень—чэрвень бягучага года) толькі 4% ад іх агульнай колькасці мелі сярэднемесячны прыбытак на душу меней гэтага бюджэту. Малазабяспечанымі ў гарадах і гарадскіх паселішчах з'яўляюцца 3,2% хатніх гаспадарак, у сельскіх населеных пунктах — 6,1%.

Ёсць з чым пайсці на чарговыя выбары, каб атрымаць чарговую перамогу!

***

На самай справе, вельмі дакладныя падлікі і вельмі няўстойлівая сітуацыя. Бо калі ў сям'ях з'яўляюцца хоць бы адно дзіця, многія з іх трапляюць у галечу — асноўную частку ў структуры малазабяспечаных хатніх гаспадарак (67,9%) складаюць сем'і, у якіх ёсць няпоўнагадовыя дзеці. І гэта з улікам той дапамогі (таксама мізэрнай), якую шматдзетныя сем'і атрымоўваюць ад дзяржавы.

Журналісты многіх краін праводзілі на сабе эксперыменты на выжыванне ў рамках мінімальных сацыяльных стандартаў, якія дзяржава лічыць неабходным забяспечыць кожнаму. Адны пры гэтым змушалі сябе да адмаўлення ад шкодных звычак (тытунь, алкаголь), другія толькі адчувалі дыскамфорт ад таго, што давялося адмовіцца ад паездак на ўласным аўтамабілі, іншыя адкрывалі для сябе рэцэпты адносна таннага дыетычнага харчавання.

Калі б хто з беларускіх журналістаў надумаўся паставіць такі эксперымент, яму спачатку трэба было б напісаць тастамент. Бо пры норме сярэднесутачных выдаткаў у памеры тры долары, трэба выбіраць не што есці, а калі есці — кожны дзень ці два разы на тыдзень.

Бедныя ў іншых краінах да такога жорсткага выбару не змушаюцца, бо ў большасці падлікаў рыса беднасці вызначана на ўзроўні 70% сярэдняга заробку па краіне.

Звычайна кажуць, што статыстыка ведае ўсё. У гэтым пераконвае дакладнасць разлікаў — да дзесятых, а то і сотых працэнта. Хоць зразумела, што і на 50% пражытачнага мінімуму не пражывеш, а тут цябе быццам бы цвікамі да сцяны прыбіваюць — 18,4%. Ганарыцца можна. Ніхто б у свеце не выжыў, а беларускія беспрацоўныя жывуць! Без ніякай містыкі.

Рэальны факт, які сродкамі статыстыкі пацвярджаюць у кожны канкрэтны момант тысячы людзей. І разам з тым — поўны абсурд. Бо на самай справе беспрацоўны, які атрымлівае дапамогу, не павінен мець ніякіх іншых крыніц прыбыткаў. Ні дывідэндаў, ні выйгрышаў у таталізатар, ні бабульчыных спадчыны. За гэтым пільна сочаць на Захадзе, і павінны сачыць (па закону) у нас. І пазбаўляць парушальнікаў права на атрыманне сацыяльнай дапамогі, або нават судзіць за махлярства.

Беларускія ж беспрацоўныя не жывуць на тую дапамогу. Яны маюць іншыя прыбыткі.

Якія? Дакладна не дывідэнды. Гэта грошы сем'яў, гэта грошы ад нейкай незарэгістраванай дзейнасці, магчыма, нават і крадзяжоў. Нездарма ж па крымінальнай статыстыцы ў нас больш злачынцаў, чым зарэгістраваных беспрацоўных, а сярод злачынцаў — абсалютную большасць складаюць асобы, якія нідзе не працуюць і не вучацца, але афіцыйна не лічацца беспрацоўнымі. Бо які ж дурань пойдзе рэгістравацца на біржы пры такім абыякавым стаўленні да яго жыццёва важных патрэб з боку Міністэрства працы?

Малыя памеры дапамогі па беспрацоўю — гэта толькі адзін з інструментаў, якія дазваляе ўладзе ўтрымліваць узровень зарэгістраванага беспрацоўя, як кажуць, «ніжэй плінтуса». Рэальны ж узровень беспрацоўных у Беларусі з улікам усіх гэтых фактараў, з улікам прыхаванага беспрацоўя, сягае недзе да 18–30 працэнтаў.

Пра іншыя інструменты эквілібрыстыкі са статыстыкай беспрацоўя паразважаем іншым разам. Яны таксама вельмі важныя, і яшчэ больш смешныя.

КАЛОНКА ЮРЫСТА

# КАНТРАКТ ЦІ ЎЛАСНАЯ СПРАВА

**Калонка падрыхтавана Анатолем Паповым, юрыстам ПЦ «Прававая дапамога насельніцтву» (Кіеў, Украіна).**

- *Хачу адкрыць свой спартыўны клуб, у якім сам жа і буду інструктарам па баявым мастацтве — айкідо. Я ўжо знайшоў залу, што буду арандаваць. Якая працэдура і форма рэгістрацыі такога спартыўнага клуба?*
  *Бандарэнка А. Л., Віцебск*

Калі вы не будзеце наймаць працаўнікоў, можна зарэгістравацца індывідуальным прадпрымальнікам. Калі ўсё ж найманыя працаўнікі будуць, варта гэту дзейнасць зарэгістраваць як таварыства з абмежаванай адказнасцю, таварыства з дадатковай адказнасцю або як прыватнае ўнітарнае прадпрыемства.

Паводле артыкула 14 Дэкрэта прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 студзеня 2009 года № 1 «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненні дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання», для дзяржаўнай рэгістрацыі індывідуальнага прадпрымальніка ў орган, які рэгіструе, падаюцца: заява аб дзяржаўнай рэгістрацыі; фатаграфія грамадзяніна, што звярнуўся за дзяржаўнай рэгістрацыяй; арыгінал або копія плацежнага дакумента, які пацвярджае аплату дзяржпошліны.

У любым выпадку парайцеся з юрыстам, што вам будзе больш выгадна зарэгістраваць.

- *Маёй сястры Ірыне, якая атрымлівала адукацыю за кошт бюджэтных сродкаў, прапануюць пасля заканчэння інтэрнатуры заключыць кантракт не менш чым на пяць гадоў. Ці можна адмовіцца ад заключэння кантракту, ці можна настойваць на заключэнні кантракту на меншы тэрмін?*
  *Аляксандраў С. Ф., Гомель.*

Паводле пункта 5 Інструкцыі аб парадку арганізацыі і праходжання інтэрнатуры, зацверджанай Пастановай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2009 года № 1 «Аб усталяванні тэрмінаў праходжання інтэрнатуры і зацвярджэнні інструкцыі аб парадку арганізацыі і праходжання інтэрнатуры», час праходжання інтэрнатуры залічваецца ў стаж працы, але не ўключаецца ў тэрмін працы маладога спецыяліста па размеркаванні. Таму выпускнікі вышэйшых медыцынскіх вучэбных устаноў, якія атрымалі вышэйшую адукацыю дзённай формы за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, накіроўваюцца на працу па размеркаванні пасля праходжання стажыроўкі (інтэрнатуры) і абавязаныя адпрацаваць два гады пасля яе праходжання (Палажэнне аб размеркаванні выпускнікоў устаноў адукацыі, што атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную або вышэйшую адукацыю, якое зацверджана Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10.12.2007 № 1702). Заключыць кантракт на большы тэрмін магчыма толькі са згоды маладога спецыяліста.

Звярніцеся з лістом для растлумачэння ў Міністэрства аховы здароўя РБ, каб звязаліся з вашым кіраўніцтвам і перагледзелі кантракт у адпаведнасці з нормамі закона. У выпадку недасягнення станоўчага выніку пасля звароту ў вышэйшыя органы, малады спецыяліст можа звярнуцца ў суд. Ёсць і іншы выхад з сітуацыі, што склалася, — выплаціць сродкі, якія былі выдаткаваны дзяржавай на навучанне.

**Калі ў вас паўсталі пытанні па гэтай рубрыцы, юрыст адкажа на іх па тэл. (+375 29) 315-88-74**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 20 верасня, панядзелак

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** Дакументальны фільм.
**09.05** Серыял «Ганначка» (Расія).
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**11.00** Серыял «Разлучніца» (Расія).
**12.10** Камедыя «Неверагодныя прыгоды італьянцаў у Расіі» (СССР).
**14.05** Дакументальны цыкл «Невядомая версія (Украіна).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Здароўе.
**15.55** Серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу» (Расія). 1-я серыя.
**16.45** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.50** Серыял «Разлучніца» (Расія).
**18.50, 01.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Серыял «Ганначка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.40** Адмысловы рэпартаж «Жыццё прыгожае пражыць».
**21.55** Серыял «Апостал» (Расія).
**23.00** Відэафільм АТН «Кроў» цыклу «Грунвальд». Частка 1 -я.
**23.30** Трылер «Заблытаны» (Канада).
**01.15** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05, 01.05** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Шальны анёл». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: Ток-шоў «Выбар».
**22.10** «Застацца ў жывых». Шматсер.фільм.
**23.20** Навіны спорту.
**23.25** «Застацца ў жывых». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**00.15** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.20** Навіны спорту.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Выйсце». Украіна, 2009 г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Малая на мільён». ЗША, 2004 г.

---

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія). 1-я серыя.
**09.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.05** Джэймс Бонд-Агент 007. Баявік (Вялікабрытанія).
**12.05** Пра мастацтва.
**12.35** Школа рамонту.
**13.35** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.30** Пазакласная гадзіна.
**14.45** Тэлебарометр.
**15.05** Простыя практыкаванні (Расія).
**15.40** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.25** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія). 1-я серыя.
**17.30** Жаночая ліга.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Лірычная камедыя «Верныя сябры» (СССР).
**21.05** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.35** Прэм'ера. Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія). 1-я серыя.
**23.10** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.45** Авертайм.
**00.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**01.10** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.25** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.25** «Дзе золата «Чорнага прынца»?». Дакументальны фільм.
**12.15** Фільм «Моцная слабая жанчына».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Пакой смеху».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** «Чорная багіня». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.25** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.25** Тэлесерыял «Дыхай са мной». 2010 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Восенькі дэтэктыў».
**23.50** «Нічога асабістага».
**00.05** Навіны - Беларусь.
**00.15** «Весткі.ru».
**00.30** Прэм'ера. «Гарадок».

### НТВ

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.30** Сёння.
**10.20** «Мама ў вялікім горадзе».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**13.30** Серыял «Закон і парадак».
**15.10** «Цуд-людзі».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Баявік «Марскія д'яблы».
**21.40** Прэм'ера. Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.55** «Сумленны панядзелак».
**00.45** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Матаспартыўны часопіс.
**09.45** Аўтаспорт. Формула-2. Валенсія (Іспанія). Гонка 2.
**10.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Валенсія (Іспанія).
**11.30** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 21.
**12.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 62 кг. Анталія (Турцыя).
**13.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). Дзень 2.
**14.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). Дзень 3.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**21.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 63 кг. Анталія (Турцыя).
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.35** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Вось дык так!!!
**23.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**01.15** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). Дзень 3.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Бітва на рацэ Ула».
**07.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.55** ПраСвет.
**08.20** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Рэйс добрага смаку».
**08.45** Прыватная калекцыя.
**09.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.15** Басаног па свеце: «Вярблюд».
**09.45** Дакументальная гадзіна: «Дамова з Гітлерам», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**10.40, 17.35** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 12 серыя.
**11.25** Фільматэка майстроў: «Ціша пасля стрэлу», драма, 2000 г., Германія–Францыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Тры шалёныя нулі», тэлесерыял.
**18.20** Госць «Белсату».
**18.40** «Днюка», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**19.10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.30** Еўропа сёння.
**19.55** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Паход вызваляльнікаў», дак. фільм, Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.45** Фільматэка майстроў: «Ціша пасля стрэлу», драма, 2000 г., Германія–Францыя.
**23.20** Аб'ектыў.

## 21 верасня, аўторак

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.05** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**09.15** Серыял «Ганначка» (Расія).
**10.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**11.05** Серыял «Разлучніца» (Расія).
**12.10** Меладрама «Лясун» (Расія).
**14.15** Дакументальны цыкл «Невядомая версія (Украіна).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Альманах вандраванняў».
**15.55** Меладраматычны серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу» (Расія). 2-я серыя.
**16.45** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Разлучніца» (Расія). Заключная серыя.
**18.50, 01.05** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Серыял «Ганначка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.55** Серыял «Апостал» (Расія).
**23.00** Відэафільм АТН «Ордэн» цыклу «Грунвальд». Частка 2 -я.
**23.25** Фантастычны баявіку «Птушкі вайны» (ЗША).
**01.10** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Шальны анёл». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер.фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Уцёкі».
**23.05** Нашы навіны.
**23.20** Навіны спорту.
**23.25** «Сэнс жыцця - само жыццё».
**00.25** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.15** Нашы навіны.
**01.30** Навіны спорту.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Выйсце». Украіна, 2009г.
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Гучная справа».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Жорсткі бізнэс». Серыял.
**21.25** Прэм'ера! «Пяць хвілін».
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

---

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Інтэрны» (Расія). 1-я серыя.
**08.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія). 2-я серыя.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**11.40** Авертайм.
**12.15** «Мы і Іран». Відэафільм (БТ).
**12.55** «Запал па культуры».
**13.40** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.40** Мультсерыял «Дракончык і яго сябры» (Канада).
**15.10** Пазакласная гадзіна.
**15.20** Простыя практыкаванні (Расія).
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.45** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія). 2-я серыя.
**17.50** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск)-Ак Барс (Казань). Прамая трансляцыя. У перапынку: Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.30** Серыял «Інтэрны» (Расія). 2-я серыя.
**23.10** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.45** «Спорт-кадр».
**00.10** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.10** «Савецкі манах. Аліпій-ваяр». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.25** «Нічога асабістага». Інфармацыйнасатырычная праграма.
**11.40** Тэлесерыял «Дыхай са мной».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.05** «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** «Чорная багіня». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.25** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.25** Тэлесерыял «Дыхай са мной».
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Восенькі дэтэктыў».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.15** «Маршал Будзёны. Канец легенды». Дакументальны фільм.

### НТВ

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Следства вялі…».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Кватэрнае пытанне».
**11.20** «Жаночы погляд».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Угро».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Закон і парадак».
**15.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны баявік «Марскія д'яблы».
**21.35** Прэм'ера. Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.30** Сёння.
**23.55** Прэм'ера. «Агата Крысці. Эпілог».

### EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 63 кг. Анталія (Турцыя).
**11.15** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). Дзень 3.
**13.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**14.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). Дзень 4.
**19.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 62 кг. Анталія (Турцыя).
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 69 кг. Анталія (Турцыя).
**22.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). Дзень 4.
**00.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Жанчыны. Трынідад і Табага. 1/2 фіналу.
**01.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**01.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Сільверстоун (Вялікабрытанія). Агляд.
**02.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 69 кг. Анталія (Турцыя).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Еўропа сёння.
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**08.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Паход вызвалянікаў», дак. фільм, Польшча.
**09.25** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**09.40** «Днюка», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**10.10** «Тры шалёныя нулі», тэлесерыял.
**10.40** «Наўскач», маст. фільм, Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Тры шалёныя нулі», тэлесерыял.
**17.35** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 3 серыя.
**18.25** «Бульбаны», мультсерыял.
**18.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.45** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.15** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Бітва на рацэ Ула».
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.35** Праект «Будучыня».
**20.05** ПраСвет.
**20.35** Вагон.
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Сальда (эканамічная праграма).
**21.40** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 3 серыя: «Таксі ў цэмру», 2007 г.
**22.35** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Рэйс добрага смаку».
**23.00** «Доктар Марцін», серыял: 3 серыя.
**23.45** Аб'ектыў.

## 24 ВЕРАСНЯ, ПЯТНІЦА

### 1

**06.25** Дакументальны фільм «Сялянскі гадавы круг» («Беларусьфільм»).
**07.15** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.35** Камедыі «Паўлінка».
**10.55** Рэспубліканскі фэст-кірмаш працаўнікоў сяла «Дажынкі-2010» (г.Ліда). Прамая трансляцыя.
**12.55** Адмысловы рэпартаж АТН «Жыццё прыгожае пражыць «.
**13.10** Канцэрт Надзеі Кадышавай.
**14.30** «Еўрабачанне- 2010». Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** «Праверка чутак». Інфармацыйна-аналітычная перадача.
**16.40** Дакументальны цыкл «Невядомая версія (Украіна).
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Відэафільм АТН «Спрадвечная талака «цыклу «Зямля беларуская».
**19.40** Канцэрт Ф.Кіркорава.
**21.00** Панарама.
**21.40** Рэспубліканскі фэст-кірмаш «Дажынкі-2010».
**23.50** «Заза». Камедыйная меладрама (Расія).

### ОНТ

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Шальны анёл». Шматсерыйны фільм.
**12.15** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Вялікая розніца» у Адэсе. Фэст пародый. Фінал.
**22.55** «Наша Белараша».
**23.30** Фільм «Рабаванне на Бэйкер-Стрыт».
**01.30** Нашы навіны.
**01.45** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Жорсткі бізнэс». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.35** Прэм'ера. «Не хлусі мне!».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «З чаго пачынаецца Радзіма».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Прэм'ера! Ток-шоў «Лёс».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Красуні». Францыя, 1998 г.
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.05** Фільм «Заражаны». ЗША-Германія-Вялікабрытанія, 2000 г.
**01.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Жаночая ліга.
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія). 4-я серыя.
**08.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія). 5-я серыя.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.45** Час футболу.
**11.15** Дакументальны фільм «Лепшыя кампазітары сусветнага кінематографу. Марыс Жар» (Францыя).
**12.10** Меладраматычны серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка).
**13.15** Мультсерыял «Дракончык і яго сябры» (Канада).
**13.30** Пазакласная гадзіна.
**13.45** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі» (Аўстралія).
**14.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія). 5-я серыя.
**15.40** Усё аб бяспецы.
**16.10** Баскетбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Аўстралія-Беларусь. Прамая трансляцыя.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**20.00** Калыханка.
**20.15** Тэлебарометр.
**20.20** «Бітва экстрасэнсаў».
**21.25** Авантурная камедыя «Мянялы» (Расія).
**23.10** «Пра мастацтва».
**23.40** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі» (Аўстралія).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія, 2010 г.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.25** «Кулагін і партнёры».
**11.55** Тэлесерыял «Земскі доктар». Расія, 2010 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.05** Прэм'ера. «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Чорная багіня». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.25** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія, 2010 г.
**20.25** Тэлесерыял «Земскі доктар». Расія, 2010 г.
**22.20** Навіны - Беларусь.
**22.30** Прэм'ера. «Крывое люстэрка».
**00.40** Фільм «Ненаглядны мой».

### НТВ

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.25** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**08.45** «Руская сенсацыі».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.10** «Лепшы горад Зямлі».
**12.00** Дэтэктыўны серыял «Угро».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Дакументальная драма.
**21.00** Прэм'ера. «Нтвшнікі».
**22.10** Прэм'ера. Вострасюжэтны фільм «Пытанне гонару».
**23.55** Дэтэктыў «Шызафрэнія».

### EUROSPORT

**09.30** Дзюдо. Чэмпіянат свету. Токіо (Японія).
**10.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). Дзень 6.
**11.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 75 кг. Анталія (Турцыя).
**12.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 77 кг. Анталія (Турцыя).
**13.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 77 кг. Анталія (Турцыя).
**14.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). 1/8 фіналу.
**19.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 77 кг. Анталія (Турцыя).
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 85 кг. Анталія (Турцыя).
**22.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). 1/8 фіналу.
**00.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Сан-Рэма (Італія). Дзень 1.
**00.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**01.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 85 кг. Анталія (Турцыя).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**08.05** Рэпартэр (публіцыстычна-інфармацыйная праграма).
**08.35** Форум: «Беларускі інтэрнэт».
**09.15** Басаног па свеце (спазнаваўчая праграма): «Вярблюд».
**09.40** Хто ёсць кім?: Аляксандр Вайтовіч.
**10.00** «100 хвілін вакацыяў», тэлесерыял.
**10.25** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 2, 12 серыя.
**11.15** «Фальшываманетнікі. Вяртанне «Згаі», серыял: 7 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Чароўнае дрэва», серыял.
**17.30** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 2, 12 серыя.
**18.20** Форум: «Беларускі інтэрнэт».
**19.05** Маю права (прававвая праграма).
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.05** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 3 серыя: «Таксі ў цемру», 2007 г.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Госць «Белсату».
**21.40** Невядомая Беларусь: «Як пошуг маланкі», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**22.10** «Краявід пасля бітвы», маст. фільм, 1970 г., Польшча.
**23.55** Аб'ектыў.

## 25 ВЕРАСНЯ, СУБОТА

### 1

**06.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Асабнякі, дзе вяршылася гісторыя» (Францыя).
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.35** Пазнавальны серыял «Чалавек супраць дзікай прыроды» (ЗША-Вялікабрытанія).
**10.30** Дак. цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**11.25** Дакументальны цыкл «Невядомая версія. Мужыкі» (Украіна).
**12.10** Меладрама «Мужыкі» (СССР).
**14.05** Прэм'ера. Дакументальны фільм «Завядзёнка» (Беларускае тэлебачанне).
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.15** Дакументальна-гістарычны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна).
**17.10** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**17.40** Відэафільм АТН «Магілёўскія відарысы» цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.00** Навіны.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Канцэрт Ф.Кіркорава.
**21.00** Панарама.
**21.40** Фільм тыдня. Меладрама «Жыццё, або Нешта ў гэтым родзе» (ЗША).
**23.25** Трылер «Ганібал. Узыходжанне» (Францыя-Вялікабрытанія-Італія-Чэхія).

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00** Нашы навіны.
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** Прэм'ера. «Людміла Максакава. Дама з характарам».
**12.10** Тэлечасопіс «Звяз».
**12.40** Фільм «Белае сонца пустэльні».
**14.10** «КВЗ». Прэм'ер-ліга. Фінал.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Тур дэ Франс».
**17.15** «Хвіліна славы».
**18.55** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**19.55** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Вялікая розніца».
**22.10** «Дэтэктар хлусні».
**23.15** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.55** Фільм «Дзяўчына ў парку».

### СТВ

**07.35** «Вовачка - 2». Камедыйны серыял.
**08.30** Фільм «Выспа скарбаў». СССР, 1982 г. Заключная серыя.
**09.40** «Дабро пажаліцца».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.50** «Дарагая перадача».
**14.00** Фільм «Сто дзён пасля дзяцінства». СССР, 1975 г.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «Дзве гісторыі аб каханні». Расія, 2009 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Прэм'ера! Фільм «Выспа праклятых». ЗША, 2010 г.
**00.00** Прэм'ера! Фільм «Уладар буры». ЗША, 2008 г.
**02.10** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.50** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.25** Усё аб бяспецы.
**08.50** Нашы тэсты.
**10.00** Жаночая ліга.
**10.30** «Рэальны свет».
**11.05** Жансавет.
**11.50** Тэлебарометр.
**11.55** «Запал па культуры».
**12.35** Фільм-казка «Горад майстроў».
**14.10** Дакументальны фільм «Шлях да святла» (Беларускае тэлебачанне).
**14.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Манчэстэр Сіці-Чэлсі. Прамая трансляцыя.
**16.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск)-»Аўтамабіліст» (Екацярынбург). Прамая трансляцыя.
**19.15** «Восенькскі жарт з…». Гумарыстычная праграма (Расія).
**19.55** Тэлебарометр.
**20.00** Джэймс Бонд-Агент 007. Баявік (Вялікабрытанія).
**22.05** Баскетбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Канада - Беларусь.
**23.45** Жывы гук.

### РОССИЯ

**07.00** «Крывое люстэрка».
**08.50** Фільм «Дрэнны добры чалавек».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Ненаглядны мой».
**13.30** «Нататкі натураліста».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Яны ваявалі за Радзіму». Фільм аб фільме.
**15.05** Фільм «Справа Румянцава».
**17.00** «Суботні вечар».
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** Прэм'ера. «Сакрэтная азбука жыцця. Таямніцы ДНК». Дакументальны фільм.
**20.35** Фільм «Піцэрскія вакацыі». 2009 г.
**23.15** Фільм «Дрэнны добры чалавек».
**00.55** Прэм'ера. «33 вясёлыя літары».

### НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.25** «Жывуць жа людзі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Жаночы погляд».
**14.15** Меладрама «Па: Сучасная гарадская казка».
**16.00** Сёння.
**16.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Злачынства будзе раскрыта».
**17.25** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.10** «Руская сенсацыі».
**22.15** «Ты не паверыш!».
**23.15** Фільм «Шпількі-2».

### EUROSPORT

**09.35** Ралі. Ралійная серыя IRC. Сан-Рэма (Італія). Дзень 1.
**10.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Жанчыны. Трынідад і Табага. 1/2 фіналу.
**11.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Жанчыны. Трынідад і Табага. 1/2 фіналу.
**12.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 85 кг. Анталія (Турцыя).
**13.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). 1/8 фіналу.
**15.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). 1/4 фіналу.
**18.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 94 кг. Анталія (Турцыя).
**20.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны. + 75 кг. Анталія (Турцыя).
**21.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). 1/4 фіналу.
**00.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Сан-Рэма (Італія). Дзень 2.
**00.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Жанчыны. Трынідад і Табага. 1/2 фіналу.
**01.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Жанчыны. Трынідад і Табага. Фінал.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** Невядомая Беларусь: «Як пошуг маланкі», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**08.40** Маю права (прававвая праграма).
**09.00** Форум (ток-шоу): «Беларускі інтэрнэт».
**09.40** «Чароўнае дрэва», серыял: 3 серыя.
**10.05** Калыханка для самых маленькіх.
**10.45** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 3 серыя: «Таксі ў цемру».
**11.40** «Краявід пасля бітвы», маст. фільм, 1970 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.00** Незвычайнае жыццё, звычайныя людзі: «Згубленыя вакацыі», дак. фільм, 2006 г., Чэхія.
**18.55** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.05** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.25** Басаног па свеце (спазнаваўчая праграма): «Сярод бербераў».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Дзённік ягонае жонкі», маст. фільм, 2000 г., Расія.
**22.55** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Казка».
**23.05** Аб'ектыў.

МЕРКАВАННЕ

# СПРАВА АНАРХІСТАЎ

Алег НОВІКАЎ

**Справа анархістаў, якіх абвінавацілі ў падпале расійскай амбасады, здаецца рымейкам справы 3 ліпеня: ідуць масавыя аблавы без аніякага канкрэтнага выніку. Аднак пэўныя наступствы для грамадскага палітычнага жыцця краіны гэта зачыстка анархічнай сцэны будзе мець.**




**Даведка:**
Пасля таго, як нейкая, дасюль нікому не вядомая групоўка «Сябры свабоды» ўзяла на сябе адказнасць за напад на расійскую амбасаду, былі затрыманыя сямёра грамадскіх актывістаў. 3 верасня, а 6-й раніцы супрацоўнікамі праваахоўных органаў у цывільным былі затрыманыя Ігар Багачак, Валерыя Хоціна, Сяргей Слюсар, Мікалай Дзядок, Аляксей Жынгяроўскі і Аляксандр Францкевіч. З кватэры, дзе жылі маладзёны, канфіскавалі пяць кампутараў, два ноўтбукі, мабільныя тэлефоны, часопісы ды грошы.
Праз дзевяць дзён, 12 верасня, з ізалятару часовага ўтрымання на Акрэсціна без прад'яўлення абвінавачвання выйшлі Валерыя Хоціна, Сяргей Слюсар, Аляксей Жынгяроўскі, Антон Лапцёнак і Ігар Багачак. Аляксандр Францкевіч перавезены ў Салігорск. Ён зараз падазраецца ў падпале апорнага пункту міліцыі.
8 верасня былі таксама затрыманыя Уладзімір Валодзін, Аляксандр Бугаёў і Таццяна Семянішчава. Грамадскі дзеяч, сябар савета Беларускай партыі «Зялёныя» (БПЗ) Уладзімір Валодзін падазраецца ў дачыненні да падпалу аддзялення «Беларусбанка» 30 красавіка 2010 года. Супрацоўнікі міліцыі правялі вобыск, канфіскавалі цвёрды дыск з яго персанальнага кампутара і некалькі ўлётак. Праз тры дні Валодзін быў адпушчаны і зноў затрыманы — ужо па падазрэнні ў атацы на Цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў з кактэйлямі Молатава 6 верасня.
10 верасня Еўрапейская зялёная партыя (ЕЗП) і камісія Сейма Літвы па ядзернай энергетыцы зрабілі афіцыйныя заявы наконт затрымання Валодзіна, дзе выказваюць сур'ёзную занепакоенасць наконт яго знаходжання пад вартай. ЕЗП запатрабавала адпусціць Валодзіна і іншых неабгрунтавана затрыманых.

Як вядома, Максім Багдановіч, калі вучыўся ў яраслаўскай гімназіі, захапляўся ідэямі анархізму і нават змайстраваў нешта накшталт бомбы, якую ўзарваў у сценах альма матэр. Усё закончылася выклікам да дырэктара.

Страшна ўявіць сабе, які лёс чакаў бы будучага класіка беларускай літаратуры, калі б ён зладзіў штосьці такога кшталту ў цяперашняй Беларусі. Яго б на сто працэнтаў выключылі з навучальнай установы, а пры наяўнасці доказаў арганізацыі выбуху адправілі б на нары. Калі б доказаў не знайшлося, то папросту па факту знойдзеных пры вобшуку твораў Бакуніна запісалі б у тэрарысты, арыштавалі і пасадзілі ў тагачаснае мясцовае Акрэсціна. І трымалі б за кратамі па схеме, якой няма ні ў адным падручніку па праву: кожныя тры дні працягвалі б тэрмін арышту, прад'яўляючы ўсе новыя абвінавачанні.

Пры параўнанні дзвюх апісаных мадэляў барацьбы з маладымі лібертарыямі (так называюць сябе самі анархісты) «дарэвалюцыйная» выглядае значна больш эфектыўнай. Той жа Багдановіч, хаця і захаваў левыя антыманархічныя погляды, хутка «перахварэў» анархізмам і падаўся ў літаратары.

Што да беларускай дзяржавы, то яна сваімі нязграбнымі дзеяннямі супраць анархічнай тусоўкі атрымала комплекс праблем. Іх наступствы, натуральна, не будуць для яе фатальнымі, аднак сваю ролю ў працэсе дэмантажу сістэмы адыграюць.

Пакінем за рамкамі той момант, што анархізм — гэта дактрына, якой, каб існаваць, у адрозненні ад тэорый рынкавага сацыялізму, не патрэбны інстытут ідэалагічных работнікаў, штучна створаная стотысячная арганізацыя «Белая Русь», прымусовая падпіска на адпаведныя выданні, свае каналы на тэлебачанні. Ідэі сацыяльнай роўнасці, найпрасцейшай дэмакратыі выжывалі нават у самых аўтарытарных краінах, кшталту нацысцкай Германіі і СССР. У гэтым сэнсе знішчыць анархічны андэграўнд у Беларусі апрыёры нельга.

Галоўны промах, які зрабілі тыя, хто замовіў зачыстку, звязаны з характарам анархічнага руху. Дзяржава мае справу з моладзевай субкультурай, а не са звычайнай палітычнай арганізацыяй. Анархізм у якасці больш-менш структурна арганізаванага руху спыніў сваё існаванне ў Беларусі прыблізна на пачатку гэтага стагоддзя, калі паступова сышла са сцэны Федэрацыя анархістаў Беларусі (ФАБ).

ФАБ, якая была створана ў 1992 годзе, арыентавалася на фармат няўрадавай, дзеючай у прававым полі, грамадскай арганізацыі, якая акрамя прапаганды падтрымлівала цесныя кантакты з прафсаюзамі і альтэрнатыўнай культурнай сцэнай. Такая мадэль існуе амаль ва ўсіх еўрапейскіх краінах. Аднак у беларускіх умовах рэалізаваць яе, па зразумелых прычынах, вельмі складана.

Нейкі час функцыі каардынацыйнага цэнтру беларускіх анархістаў часткова выконвала рэдакцыя газеты «Навінкі». У 2003 годзе праект забаранілі. Пачалася поўная дэфрагментацыя анархічнага руху. Дадатковым чыннікам стаў прыход інтэрнэту з яго гарызантальнымі формамі камунікацыі.

Сёння беларускі анархізм — гэта масіў моладзевых сацыяльна-культурных ініцыятыў, аб'яднаных па прынцыпу спажывання адных і тых жа культурных і інфармацыйных прадуктаў. Знішчыць паліцэйскімі метадамі сектар немагчыма. Для гэтага было б патрэбна забараніць цэлыя напрамкі рок-музыкі, элементы гардэробу, літаратурныя творы, фільмы.

Затое цяпер усё гэта набывае апазіцыйнае адценне. Цяжка сказаць, каго да апошніх падзей анархісты не паважалі больш: рэжым або апазіцыю, якую яны лічылі прадажнай і буржуазнай. Вераснёўскія рэпрэсіі відавочна падштурхнуць анарха-субкультуру да больш шчыльных кантактаў з «адмарозкамі», якія напрацавалі сістэму прававой абароны сваіх актывістаў, прымусяць анархістаў інтэгравацца ў шэрагі апазіцыі.

Па-другое, анархісты — частка глабальнага левага, прафсаюзнага і экалагічнага руху. Многія вядомыя левыя палітыкі выйшлі з шэрагаў анархічных гурткоў (напрыклад, Даніэль Кон-Бендзіт — лідэр французскіх Зялёных і Ота Шылі — былы міністр МУС ФРГ). У Расійскай дзяржаўнай думе засядаюць мінімум тры былых анархіста, а Андрэй Ісаеў — віцэ-спікер расійскага парламенту, увогуле экс-лідэр Канфедэрацыі анарха-сіндыкалістаў (КАС) — галоўнай анархісцкай арганізацыі ў часы Перабудовы.

У кантэксце апошняга «хапуна» стаўленне да Мінску з боку прафсаюзаў і партый левага спектру відавочна пагоршыцца. А якраз яны да гэтага часу часта выступалі пасіўнымі абаронцамі беларускай мадэлі. Па той прычыне, што анархісты з'яўляюцца заклятымі ворагамі фашыстаў, рэпрэсіі супраць іх таксама будуць разглядацца шмат кім як пераслед антыфашыстаў, што наўрад ці дадасць плюсаў знешняму іміджу Беларусі.

Сучасная арганізацыйная мадэль анархістаў — непублічны, мазаічны, часам канспіратыўны рух з радыкальнай рыторыкай — стварае ідэальную глебу для правакацый спецслужбаў. За прыкладамі далёка хадзіць не трэба. У 2003 годзе падчас акцыі «Украіна без Кучмы» намёты гарадок апазіцыі атакавалі дзецюкі з нікому не вядомага Сіндыката анархістаў Украіны, якія быццам помсцілі прыхільнікам Юлі Цімашэнка, што яны абразілі сябра іхняй групоўкі. Пазней стала вядома, што «анархістамі» былі курсанты школы Службы бяспекі Украіны.

Хутчэй за ўсё, групоўка «Сябры свабоды», якая ўзяла на сябе адказнасць за падпал расійскай амбасады ў Мінску, ні што іншае, як свайго кшталту тутэйшая рэдакцыя Сіндыкату анархістаў Украіны. Пытанне толькі, ці апошняя і ці створаная ў Беларусі?

Нарэшце, для асабістай ідэнтыфікацыі цяперашніх анархістаў важную ролю адыгрывае перманентнае супрацьстаянне з правай радыкальнай субкультурай скінхедаў. Гэта падобна на своеасаблівую канкурэнцыю па прынцыпу: «хто больш круты». З асяроддзя скінхедаў чэрпае кадры беларуская правая і часткова нацыяналістычная моладзевая апазіцыя. Уся цёмная гісторыя з падпалам можа выклікаць у мазгах падлеткаў з правай тусоўкі комплекс: «Блін, аказваецца, анархісты больш крутыя. Яны нават падпалы робяць. А чаму мы не можам?» На выхадзе дзяржава можа атрымаць паступовую радыкалізацыю ўсёй моладзевай апазіцыйнай сцэны.

У якасці рэзюме артыкула можна яшчэ раз заклікаць беларускія спецслужбы браць прыклад з дырэктара яраслаўскай гімназіі, які калісьці разбіраўся з анархістам Максімам Багдановічам. Дырэктар спачатку думаў, а пасля рабіў. На жаль, ягонае імя гісторыя не захавала.

**P.S.:** Аўтар артыкулу — адзін з заснавальнікаў Федэрацыі анархістаў Беларусі.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Прадукты з забруджанай радыяцыяй беларускай зямлі практычна цалкам сыходзяць на экспарт. Паводле дадзеных сацыялагічных апытанняў, большасць беларусаў не хочуць купляць выраблёнае ў забруджанай зоне. Каб хоць неяк пераканаць спажыўцоў у бяспецы беларускіх прадуктаў, Лукашэнку і яго чыноўнікам даводзіцца звяртацца да адкрытага папулізму. Каб спажыўцы не білі трывогу, беларускі прэзідэнт вырашыў пераканаць іх у бяспецы «чарнобыльскіх» мяса і гародніны на ўласным прыкладзе. Ён выступіў па тэлебачанні і даў урачыстае абяцанне праводзіць па адным тыдні на год у «чарнобыльскіх» раёнах, харчавацца выгадаванымі там гароднінай і мясам і запіваць усё гэта вадой з забруджаных рэк і калодзежаў.

**Городской сайт Даугавпилса (Латвія)**

Найбольш верагодным варыянтам развіцця падзей, уключаючы і будучую перамогу Лукашэнкі на выбарах, з'яўляецца стварэнне ў Беларусі сітуацыі, спрыяльнай для сацыяльна-наменклатурнага перавароту на працягу наступных некалькіх гадоў. У першую чаргу, для рэспублікі будуць створаны неспрыяльныя ўмовы эканамічнага развіцця: высокія кошты на энерганосьбіты, адмена рознага кшталту эканамічных прэферэнцый, як на Захадзе, так і ў Расіі, адмова ад камерцыйнага і іншага супрацоўніцтва з беларускімі партнёрамі, увядзенне штрафных санкцый і г. д. Пры гэтым Масква і Брусель будуць дзейнічаць на гэтым этапе сумесна, бо цяперашні беларускі лідэр перастаў задавальняць патрабаванням абодвух бакоў.

**«Регнум» (Расія)**

Памёр вядомы беларускі дэмакратычны актывіст. Яго надмагільны камень мог бы мець форму пытальніка і клічніка. Цяжка паверыць, што Алег Бябенін здзейсніў самагубства, калі яшчэ ў апошняй смс ён дамаўляўся з сябрамі пайсці ў кіно і будаваў прафесійныя планы на блізкую будучыню.

**«Pravda» (Славакія)**

Расійска-беларускія адносіны сапсаваныя да такой ступені, што нагодай для канфліктаў становяцца любыя дробязі. На фоне ўсеагульнага харчовага дэфіцыту з беларускіх крамаў зніклі грэцкія крупы і сметанковае масла. Мясцовая грамадскасць тут жа прапанавала версію — дэфіцытныя прадукты прададзеныя ў Расію.

**«Независимая газета» (Расія)**

Улады Беларусі эмацыйна паабяцалі, што дазволяць правесці незалежнае расследаванне смерці Алега Бябеніна экспертам АБСЕ. Можа, яны разлічваюць на тое, што эксперты будуць задаволены дадзенымі беларускага следства? Але наўрад ці яны ім спадабаюцца. Бо міліцыя нават не знайшла час зняць адбіткі пальцаў на месцы злачынства. Невядома нават, ці ёсць адбіткі пальцаў Алега на бутэльках таго пойла, якім ён нібы ўпіўся. Экспертыза цела таксама была праведзена павярхоўна. Для звычайных прафесійных следчых будзе патрэбна эксгумацыя цела. Ці дадуць на яе дазвол беларускія ўлады? Ці яны лічаць, што ўвесь свет павінен верыць ім на слова?

**«Московский Комсомолец» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ПОЛЬШЧА. СЮРПРЫЗ ДЛЯ ПРАВЫХ

Сюрпрыз прынеслі вынікі апошніх апытанняў, якія правяла «Gazeta Wyborcza». Калі верыць ім, рэйтынг партыі «Саюз левых дэмакратаў» (SLD), нашчадка камуністычнай партыі, дасягнуў 20 працэнтаў. Такой папулярнасці ў чырвоных не было ўжо вельмі даўно. На апошніх выбарах яны змаглі сабраць толькі 8 працэнтаў. Прычына ўздыму даверу да левых дэмакратаў звязаная, на думку экспертаў, з паводзінамі лідэра партыі «Права і справядлівасць» (PiS) Яраслава Качыньскага. Ён і сябры партыі ўвязаліся ў дзіўную кампанію ў абарону крыжа перад прэзідэнцкім палацам. Яго паставілі ў памяць ахвяраў катастрофы пад Смаленскам. Новая прэзідэнцкая адміністрацыя з ліберальнай партыі «Грамадзянская платформа» хоча прыбраць крыж у суседні касцёл. Кансерватары рашуча супраць. Гісторыя вакол крыжа шмат каму нагадвае дзіцячыя гульні. У выніку праціўнікі лібералаў робяць выбар на карысць левых. Адначасова катастрафічна ўпаў рэйтынг партыі PiS. За кансерватараў гатовыя галасаваць толькі 25 працэнтаў электарату.

**Па матэрыялах «Dzennik» (Польшча)**



### УЗБЕКІСТАН. ГАЛОЎНЫ ГЛОБУС КРАІНЫ

У далёкім 995 годзе ў горадзе Харэзме вучоны Абу Райхан Беруні зрабіў глобус. Ва Узбекістане лічыцца, што гэта быў першы глобус у чалавечай гісторыі. Гэты факт даў падставу цяперашнім узбекскім уладам стварыць сапраўдны культ вакол глобусаў. Карымаў за гады незалежнасці пакрыў усю краіну помнікамі глобусу. Вывяа глобусу нават замяніла статую Леніна на цэнтральнай плошчы Ташкента. Самае цікавае, аднак, тое, што на ўсе глобусы нанесена толькі адна краіна — Узбекістан. Апошні 18-метровы помнік глобусу прэзідэнт адчыніў 30 жніўня ў Бухары. Новы помнік паставіў шмат каго ў тупік. Справа ў тым, што ўсе замежныя дэлегацыі наведваюць у Ташкенце галоўны глобус, паколькі, як тлумачыцца іншаземцам, гэта самы вялікі глобус у краіне. Аднак помнік у Бухары большы за ташкенцкі.

**Па матэрыялах «Фергана.Ру» (Узбекістан)**

### ГЕРМАНІЯ. ГАЛОЎНЫ СКАНДАЛІСТ – НАРОДНЫ ГЕРОЙ

Калі Ціла Сарацын — сябра партыі сяцыял-дэмакратаў і былы міністр фінансаў ураду Берліна, пачаў з мінулага года рэгулярна дазваляць сабе выказванні супраць эмігрантаў, шмат хто вырашыў, што ён або вар'ят, або палітычны самазабойца. Цяпер жа, аднак, высвятляецца, што ён зрабіў сваімі скандаламі нядрэнны плацдарм для прарыву ў вялікую палітыку. Калі верыць вынікам апытання, якое правяла сацыялагічная фірма «Emnid-Umfrage», амаль кожны пяты немец (18 працэнтаў) гатовы прагаласаваць за партыю, лідэрам якой будзе Ціла. Самай вялікая падтрымкай Сарацын карыстаецца сярод электарату партыі Левыя і Саюза хрысціянскіх дэмакратаў. Цяжка сказаць, ці наважыцца enfant terrible нямецкай палітыкі на стварэнне сваёй уласнай партыйнай структуры. У любым выпадку, яго тэзісы ўжо пачалі актыўна ўжываць правыя папулісцкія партыі і некаторыя сябры Саюзу хрысціянскіх дэмакратаў.

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

### КАЗАХСТАН. СПРОБА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕРАВАРОТУ

Высвятляецца, што 30 жніўня ў Казахстане мела месца спроба дзяржаўнага перавароту. Пра гэта спачатку ананімна паведаміла група супрацоўнікаў Камітэта нацыянальнай бяспекі, а пасля сур'ёзнае агенцтва КазТАГ. Калі верыць гэтым крыніцам, за змовай стаяла генеральная пракуратура, два супрацоўніка якой былі арыштаваныя ў той жа дзень. Па словах чэкістаў, гэтыя супрацоўнікі, якія звязаны з так званым Паўднёвым кланам, спрабавалі наняць кілера для забойства Лідэра нацыі. Аднак незалежная прэса схіляецца да версіі, што ніякай спробы перавароту не было. Хутчэй, быў чарговы эпізод барацьбы груповак у вышэйшых эшалонах улады. Сілавікам удалося пераканаць Назарбаева ў тым, што паўднёвыя рыхтуюць ягонае забойства. Так ці інакш, але вайна паміж кланамі за месца Назарбаева, адстаўку якога чакаюць у 2012 годзе, выходзіць на вырашальную стадыю. У хуткім часе з Астаны трэба чакаць новых сенсацыйных навінаў пра перавароты і змовы.

**Па матэрыялах казахскай прэсы**

### ФРАНЦЫЯ. ФЕСТЫВАЛЬ «HUMANITE»

У Парыжы прайшоў 80-ы фестываль газеты «Humanite». «Humanite» — былы орган французскай Камуністычнай партыі, а цяпер незалежнае левае выданне. У 1930 годзе ў рэдакцыі нарадзілася ідэя праводзіць штогод у другі ўік-энд верасня фестываль, у праграму якога ўваходзілі выступы артыстаў і палітычныя дэбаты. На той момант, праўда, галоўнай ідэяй фестывалю быў збор грошай у падтрымку амерыканскіх анархістаў Сака і Ванцэці, якіх судзілі па сфабрыкаванай справе. Пазней фестываль ператварыўся ў асобную крыніцу фінансавай падтрымкі выдання. Так, на фестывалі 2009 года ў ім удзельнічала 600 тысяч чалавек. Але рэкорд быў пастаўлены ў 1945-м, калі фестываль наведалі каля мільёна чалавек. У шматлікіх сем'ях лічыцца фамільнай традыцыяй хадзіць на fete de l'Huma — так французы скарочана называюць свята. Кульмінацыяй праграмы лічыцца калектыўнае спяванне Марсельезы і Інтэрнацыянала.

**Па матэрыялах «Humanite» (Францыя)**

З НАГОДЫ



# ХРОСНЫ МЭР

**Услед за Лукашэнкам чорную метку ад Крамля атрымаў Юры Лужкоў: на НТВ выйшаў зняты па канонах «Хроснага бацькі» фільм «Справа ў кепцы» пра маскоўскага мэра Юрыя Лужкова. Пра тое, чаму пад удар трапіў мэр расійскай сталіцы, журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з маскоўскім сацыяльным актывістам Андрэем Сахніным.**




*— Пра што гэты фільм?*

— У фокусе аўтараў практыка выкарыстання Юрыем Лужковым муніцыпальных рэсурсаў у сваіх прыватных інтарэсах. Напрыклад, расказваецца пра тое, як ён выдаткаваў 200 мільёнаў рублёў на сваю пасеку. Пра тое, як ён лабіруе інтарэсы сваёй жонкі Алены Батурынай — дарэчы, самай заможнай жанчыны ў Еўропе. Адначасова стваральнікамі стужкі рабілася праекцыя на жыццё простых масквічоў. Так, у фільме ідзе гаворка, што быццам тыя грошы, якія пайшлі на ўпарадкаванне пчол Лужкова, маглі выратаваць здароўе ўсіх пенсіянераў сталіцы ад наступстваў летняга смогу. У прынцыпе, гэта дастаткова прымітыўная прапагандысцкая стужка, аднак яна мела эфект.

*— Як сустрэлі масквічы фільм?*

— Масквічы паставіліся да яго з вялікай цікавасцю. Увогуле, «Справу ў кепцы» было цяжка не заўважыць у сетцы вяшчання тэлевізійных праграм. Фільм з вялікай помпай рэкламавалі за некалькі дзён да трансляцыі. У дзень дэманстрацыі «Справы ў кепцы» каля экранаў сабралася 9 працэнтаў маскоўскай аўдыторыі. Фільм сапраўды трапіў у кропку. Справа ў тым, што ў апошнія гады імідж Лужкова ў Маскве пагоршыўся. Лепшыя часы Лужкова былі звязаныя з 1990-мі гадамі, калі на фоне ўсеагульнага хаосу Масква выглядала кантрастам: добрыя пенсіі, развіццё гарадской інфраструктуры, высокія заробкі. Цяпер, калі сітуацыя больш-менш стабільная, становяцца відавочнымі некаторыя правалы лужкоўскай палітыкі: пробкі, лобі для сваіх сямейных бізнес-структур, дрэнная экалогія. Нарэшце, за 20 гадоў Лужкоў папросту надакучыў.

*— Чаму Крэмль пачаў атаку на маскоўскую мэрыю?*

— Я думаю, што тут мела месца скрыжаванне дзвюх тэндэнцый. Па-першае, Лужкоў папросту не ўпісваецца ў мядзведзеўскую сістэму. Прайшлі пуцінскія часы, калі сістэма кіравання на месцах будавалася па прынцыпу: «вось табе, чыноўнік, вотчына — кіруй ёй і праяўляй за гэта да мяне лаяльнасць». Цяпер трэба быць у дадатак сябрам крамлёўскай каманды, да якой Юры Міхайлавіч не належыць. Па-другое, Мядзведзеў апошнім часам носіцца з лозунгам лібералізацыі. І праявіць сябе лібералам у сітуацыі вакол Хімкінскага лесу было вельмі карысна. Мітынг у абарону Хімкінскага лесу сабраў у сталіцы не бачаную дагэтуль колькасць людзей — 3000–4000 чалавек. У падтрымку эколагаў выступілі вядомыя культурныя асобы. Гэта ўсё было вельмі не звычайна. І наехаць на Лужкова, які быў звязаны з праектам трасы праз лес, у атмасферы агульнай нянавісці да мэра, было лагічна. Нізавыя сацыяльныя ініцыятывы ў Маскве за апошнія часы сталі вельмі папулярныя, і з імі трэба лічыцца.

*— Якая была рэакцыя мэра на стужку?*

— Ён заявіў, што ўсё прадэманстраванае на экране — хлусня. Сказаў пра намер падаваць у суд на федэральныя каналы, якія транслявалі праграму пра мэра. Таксама ён пагражае газетам, якія надрукавалі артыкулы, у якіх журналісты паўтарылі асноўныя тэзісы фільму. Адным словам, у адрозненні ад Муртазы Рахімава, экс-прэзідэнта Башкірыі, які пасля паказу падобнай карціны адразу пайшоў у адстаўку, Лужкоў вырашыў не здавацца. Прынамсі, пакуль. На думку экспертаў, Лужкоў робіць стаўку на некаторыя супярэчнасці ўнутры крамлёўскай адміністрацыі. Сапраўды, чаму Мядзведзеў папросту не зняў Лужкова, што яму як прэзідэнту дазваляе канстытуцыя? Самы просты адказ — таму што гэтага не хоча Пуцін. Версіі пра канфлікт паміж прэзідэнтам і прэм'ерам добра пасуе пачатак у афіцыйных СМІ буйной кампаніі па праслаўленню прэм'ера. Узгадайце той жа аўтамабільны прабег Пуціна па Далёкаму Усходу. Гэта можна лічыць сігналам, што Пуцін плануе заставаца на вяршыні ўлады. І, зразумела, ён можа ў тактычнай вайне з Мядзведзевым выкарыстаць фігуру Лужкова.

***— Ці можа Лукашэнка, як і Лужкоў, скарыстацца спрэчкай паміж Пуціным і Мядзведзевым?***

— Цяжка сказаць. У дадзеным выпадку Лукашэнка не выглядае крэатурай Пуціна, як у выпадку ў Лужковым. Усё залежыць ад развіцця падзей, ад таго, наколькі глыбокай будзе канфрантацыя. У любым выпадку, Пуцін абараняе Лужкова толькі сітуацыйна. Атрымаўшы нейкія гарантыі ад Мядзведзева на захаванне сваіх пазіцый у вялікай палітыкі, ён можа лёгка ахвяраваць маскоўскім мэрам.

***— Калі Лужкоў сыдзе з пасады мэра, па канстытуцыі Мядзведзеў павінен прызначыць новага гарадскога старшыню. Ці можа сталічная грамадскасць прымусіць прэзідэнта прызначыць якога-небудзь кандыдата?***

— Гэта пытанне пачало актыўна дыскутавацца ў асяроддзі маскоўскай апазіцыі пасля выхаду фільма. Сапраўды, сярод нізавых актывістаў ёсць асобы, якія маюць дастатковую вялікую папулярнасць, напрыклад, Сяргей Удальцоў. Калі пачнецца працэс падзення Лужкова, дэмакраты плануюць арганізаваць нешта накшталт збору подпісаў за свайго кандыдата на пасаду мэра. Аднак ці пагодзіцца Мядзведзеў на такую кандыдатуру — вялікае пытанне. Пасада мэра Масквы фактычна адпавядае пасадзе федэральнага міністра. Іншымі словамі, абвешчаная лібералізацыя мае свае межы.

МЕРКАВАННЕ

# УКРАІНСКАЯ МОЎНАЯ КОНТРРЭВАЛЮЦЫЯ

**Украіна на парозе моўнай рэформы. Па выніках гэтай рэформы, калі верыць апазіцыі, руская мова фактычна можа стаць другой дзяржаўнай. Пра некаторыя аспекты новай украінскай моўнай сітуацыі журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з кіеўскім палітолагам Юрыем Дакукіным.**




**Даведка**

Адпаведна законапраекту дэпутатаў ад Партыі рэгіёнаў, камуністаў і Блока Літвіна, што быў пададзены на разгляд у Вярхоўную Раду 9 верасня, ва ўсіх школах гарантуецца адукацыя на рускай мове, вучні і студэнты могуць патрабаваць навучання на рускай мове, мову навучання ў прыватнай школе вызначае яе ўласнік, у афіцыйных СМІ ўкраінскай мове адводзіцца 60 працэнтаў, судаводства можа весціся на рускай мове. На працягу восеньскай сесіі парламент павінен разгледзець прапанову дэпутатаў.

***— Як можна сцісла апісаць моўную палітыку ва Украіне ў часы незалежнасці?***

— Калі Леанід Краўчук, былы першы сакратар Кампартыі Украіны, у 1991 годзе ўключыўся ў прэзідэнцкую кампанію, ён вельмі імкнуўся пазбавіцца ад іміджу камуніста. Пазней ён супрацьпастаўляў сябе прарасійскаму Кучму. Таму ў камандзе Краўчука з'явіліся ўкраінскія нацыяналісты, якія папулярызавалі тэорыі пра тое, што сітуацыя з украінскай мовай — ключавы момант сучаснасці. Былі прынятыя законы пра тое, што ўкраінская мова з'яўляецца дзяржаўнай. Пра абавязковае выкарыстанне яе ў справаводстве і дзелавой перапісцы, у рэкламе і г.д. Паколькі галоўным супернікам наступнага прэзідэнта Кучмы былі камуністы, якія абапіраліся на рускамоўны Усход, ён моўныя законы не перагледаў. Пры Юшчанку і Цімашэнка мелі месца валюнтарысцкія спробы навязвання ўкраінскай мовы. Напрыклад, настаўнікам забаранілі размаўляць па-руску ў школах. Аднак сістэмнага ціску не было.

***— Якія вынікі такой украінізацыі?***

— Вельмі супярэчлівыя. З аднаго боку, паўстала цікавасць да мовы сярод моладзі, з'явілася гарадская моладзевая ўкраінамоўная культура. З іншага — украінская мова ў шматлікіх рэгіёнах ператварылася ў мову афіцыёзу. На ёй размаўляюць службоўцы, складаюцца міліцэйскія пратаколы, агучваюцца судовыя прысуды. Гэта выклікала пасіўны пратэст. І калі пры Юшчанку паўзучая ўкраінізацыя займела наступальны фармат, раздражненне набыло адкрытыя формы. Франтальная ўкраінізацыя відавочна супярэчыць рэальнасці. 60 працэнтаў насельніцтва Украіны двухмоўнае. Людзі думаюць на дзвюх мовах, лёгка пераходзяць з адной мовы на другую. Пры гэтым ёсць асобныя рэгіёны, дзе пераважае руская або ўкраінская мова. Так, колькасць рускамоўнага насельніцтва ў Севастопалі набліжаецца да ста працэнтаў. Моўныя рэформы слаба змянілі сітуацыю. Тыя сегменты грамадства, якія напачатку 1990-х гадоў размаўлялі па-руску, і зараз працягваюць размаўляць. У тым жа Кіеве асноўная маса ўкраінамоўных — мігранты з правінцыі. Ёсць пэўная моўная рэальнасць, зламаць якую немагчыма за кошт прававых актаў. Гэта як заробкі ў канвертах — яны фармальна забароненыя, аднак у рэальнасці існуюць.

***— Гэта значыць, рускай мове трэба надаць афіцыйны статут?***

— Я не сказаў бы, што ў выніку ўкраінізацыі руская мова вельмі папакутавала. Напрыклад, у Луганску, дзе ў мяне расце дачка ад першага шлюбу, ёсць толькі некалькі ўкраінскіх школ. І ўзровень адукацыі там самы прымітыўны. У гэтым плане законапраект вельмі кан'юнктурны. Яго падалі на разгляд парламенту адначасова з падвышэннем кошту на камуналку. Партыі рэгіёнаў трэба рабіць справаздачу перад выбарцамі. У цяперашняй сітуацыі не адзінае дасягненне — гэта абарона рускай мовы. Тым больш, на носе мясцовыя выбары, а права абласцей уводзіць рэгіянальныя мовы выдатна ўпісваецца ў такую выбарчую тэматыку. Інакш законапраект не падтрымаў Блок Літвіна — былы суб'ект аранжавай кааліцыі.

***— Якая рэакцыя апазіцыі на праект рэформы?***

— Гэты законапраект, акрамя ўсяго іншага, — вялікая пастка для аранжавай апазіцыі. Калі Цімашэнка падтрымае яго, яна пазбавіцца падтрымкі з боку Заходняй Украіны. Калі не падтрымае — ад яе адвернецца Усход і Поўдзень. Аднак сітуацыя тут больш складаная. Самы вялікі парадокс у тым, што канцэпцыя ўкраінізацыі, з якой носяцца аранжавыя, — гэта выдумка бальшавікоў. Менавіта яны на пачатку 1920-х гадоў, зыходзячы з тактычных задач, прынялі рашэнне перавесці ўсё насельніцтва Украіны на мову Шаўчэнкі. Адначасова, змагаючыся за ўкраінскага селяніна, яны навязалі ўсяму ўкраінскаму руху сялянскі правінцыйны імідж. Адсюль узяліся тыя шаравары і вусы. І цяпер украінскія нацыяналісты фактычна носяцца з тымі камуністычнымі ўтопіямі і вобразамі ідэальнага ўкраінца.

***— Якія наступствы можа мець новы закон аб мовах?***

— Ніякіх. Па-першае, акрамя перамогі на моўным фронце, Партыя рэгіёнаў нічога паказаць выбаршчыку не здольная. Таму яна будзе намагацца як мага зацягваць прыняцце закона, драматызаваць яго, арганізоўваць якія-небудзь правакацыі. Гэта значыць, што цяперашні стан моваў, хутчэй за ўсё, застанецца як мінімум да парламенцкіх выбараў 2012 года. Па-другое, я яшчэ раз падкрэсліваю, што двухмоўе ва Украіне — гэта рэальнасць, змяніць якую вельмі цяжка. Прычым рускамоўны ўкраінец — гэта не рускі. У Адэсе былы губернатар Гурвіч — сябра Нашай Украіны — заўсёды вёў усю агітацыю па-руску. Не дарма ўсе маладыя палітыкі кшталту Яцэнюка або Цігіпкі, якія арыентуюцца на тое, каб прадстаўляць інтарэсы ўсёй Украіны, дыстанцуюцца ад моўнага пытання.

> Партыя рэгіёнаў нічога паказаць выбаршчыку не здольная. Таму яна будзе намагацца як мага зацягваць прыняцце закона, драматызаваць яго, арганізоўваць якія-небудзь правакацыі

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ІРЫНА ФАРЫЁН



Ірына — адзін з кіраўнікоў украінскай нацыяналістычнай партыі «Свабода», якая падтрымала ідэю Цімашэнка правесці 8 верасня мітынг апазіцыі каля сцен Вярхоўнай Рады супраць запланаваных урадам Азарава павышэння кошту на камунальныя паслугі. Пры гэтым БЮТ выставіла нацыяналістам умову — іх лідэр Алег Цягнібок не будзе выступаць на акцыі. Прычына відавочная — характэрная для Цягнібока радыкальная рыторыка магла сапсаваць імідж праціўнікаў Януковіча. Аднак адсутнасць Цягнібока цалкам кампенсавала Ірына Фарыён. Яна выступіла з вельмі яркай прамовай наконт неабходнасці байкоту ў школах новых падручнікаў гісторыі Украіны, якія быццам з'яўляюцца акупацыйнымі. Выступ Юліі Цімашэнка быў значна слабейшы. Акрамя таго, нацыяналісты выцягнулі на мітынг футбольных фанатаў, якія стварылі карцінку для тэлебачання. У выніку галоўным для апазіцыі, якая збіралася пратэставаць пад сацыяльнымі лозунгамі, стала патрабаванне абмежаваць колькасць легіянераў ва ўкраінскіх футбольных клубах. А закончыўся мітынг шэсцем людзей да офісу Федэрацыі футбола. Адным словам, поўны сюррэалізм. Як вынік, аранжавыя абвінавацілі «Свабоду» ў тым, што партыя з'яўляецца агентам Януковіча.

### ГОРКА ПАЛАСІАС



Адзін з лідэраў левай нацыяналістычнай баскскай арганізацыі ЕТА атрымаў самы рэкордны тэрмін зняволення ў гісторыі Іспаніі. 35-гадовы баявік рашэннем суда ад 13 верасня асуджаны на 83 гады. Такое пакаранне Горка панёс за ўдзел у тэрарыстычным акце ў Мадрыдзе ў 2001 годзе. У выніку выбуху закладзенай ім бомбы быў забіты паліцэйскі. Акрамя таго, тэрарыст спланаваў некалькі акцый, вынікам якіх таксама былі чалавечыя ахвяры. Самае цікавае, што раней яго ўжо арыштоўвалі, аднак пасля чамусьці адпусцілі. Прысуд Паласіасу стаў своеасаблівым сімвалічным адказам іспанскай дзяржавы на заяву ЕТА ад 5 верасня, у якой тэрарысты паабяцалі часова спыніць вайсковую дзейнасць і нават прапанавалі Мадрыду дыялог. Іспанскі ўрад у адказ патрабаваў ад тэрарыстаў поўнай капітуляцыі ЕТА. Справа Паласіаса дэманструе намер ураду сацыялістаў пакончыць з баскскім тэрарызмам выключна сілавымі сродкамі.

### КРЫСЦІН О'ДОНЭЛ

41-гадовая кандыдатка на пасаду кандыдата ад рэспубліканскай партыі на выбарах у Сенат ЗША ў штаце Дэлавер, сябра хрысціянскай кансерватыўнай фракцыі «Tea Party» ператварыла выбары ў своеасаблівае шоў. Абіраючы свайго кандыдата ў Сенат на ўнутрыпартыйных выбарах, рэспубліканцы павінны адказаць на пытанне, ці можна займацца мастурбацыяй і глядзець парнаграфічныя часопісы. «Калі муж або жонка праглядаюць парнаграфічныя выданні, яны парушаюць вернасць адзін аднаму», — кажа Крысцін. Увогуле, па як словах, будучае галасаванне — гэта выбар за або супраць хрысціянскай сексуальнай маралі. Як не дзіўна, у Крысцін дастаткова добры рэйтынг. У вачах шмат каго яна сімвалізуе перамены, пратэст супраць коснай партыйнай эліты. Так, яе канкурэнт Майк Кастл, прамы патомак Франкліна Рузвельта, ужо двойчы быў губернатарам штату. Самае цікавае, што перамога Крысцін будзе на руку галоўным праціўнікам рэспубліканцаў — дэмакратам. Прынамсі пакуль апытанні сведчаць пра тое, што большасць жыхароў Дэлаверу не гатовыя жыць па канонам хрысціянскай маралі.



ПОСТАЦІ

# ЧАЛАВЕК-АРКЕСТР

**«Я не з першага шэрагу майстроў у сваім пакаленні. Большага поспеху ўдалося дасягнуць у стварэнні сцэнічных і рэканструкцыі гістарычных касцюмаў», — сціпла, як чалавек шляхетны, кажа мастак Юры Піскун. Дазвольце з ім не пагадзіцца. У свае 55 гадоў ён адбыўся і як мастацтвазнаўца, і як выкладчык Акадэміі мастацтва, кіраўнік Нацыянальнага мастацкага музея, дзе працаваў намеснікам дырэктара ў вырашальныя часы мадэрнізацыі гэтай установы. І як мастак: невыпадкова яго аўтапартрэт «Госці» (1996) уключаны ў грандыёзную выставу «Зямля пад белымі крыламі», днямі разгорнутую ў залах Нацыянальнага мастацкага. З мастаком гутарыць Аляксей Хадыка.**


Юры Піскун у майстэрні ля работы «Горад залаты», 2008

***— Юры Аляксандравіч, у Вас унікальная «мастацкая» сям'я — сярод тых, хто сочыць за падзеямі ў сучаснай беларускай культуры вядомыя імёны вашых жонкі Алены Юр'евай, і дачок — Вольгі, Сафіі, Валянціны...***

— Склалася так, што 30 гадоў свайго жыцця я займаюся мастацкімі акцыямі. Жонку выбіраў свядома: мы з ёй знаёмыя яшчэ з мастацкай школы. Нядаўна споўнілася 30 гадоў з нашага вяселля, і ўвесь час мы імкнёмся жыць у мастацтве, дзеля мастацтва. І зарабляць, як у добрым сэнсе рамеснікі, таксама з мастацтва. І дачок накіравалі па сваіх слядах, бачачы іх здольнасці, якія з цягам часу рэалізаваліся. Сярэдняя, Соня, больш узяла ад маці, яна здзейснілася як моцны майстар афорту. Вольга — жывапісец, пайшла ў мяне. А Валя таксама наследуе бацьку, але як мадэльер. Выканала некалькі заказаў па касцюмах для ансамбляў, зараз працуе над плакатамі для «Харошак». Усе ходзім па адным полі: мы з жонкай працавалі ў «Харошках» 18 гадоў, з 1983-га па 2001-ы, а зараз там — Валя.

***— Што можаце сказаць пра апошнія працы?***

— Пяць гадоў таму ў Палацы мастацтваў да нашага 50-годдзя была вялікая персанальная выстава, мая з Аленай Юр'евай. Мы паказалі свае лепшыя творы за доўгі перыяд, мелі добрую прэсу. Зараз многа займаюся касцюмам, фактычна не пакідаючы гэтага накірунку працы. Разам з Аляксеем Гаявым у 2007-м зрабілі 200 касцюмаў для новага спектаклю «Харошак» «Беларусы», які паставіла Валянціна Іванаўна Гаявая. Яго тэмы — поры года, беларуская гісторыя, вайна. Чарговы раз, цяпер на 40-годдзе, выканаў сцэнічныя касцюмы «Песнярам». А ўпершыню лёс звёў мяне з імі і Мулявіным перад 10-годдзем іх творчасці, калі ў выкананыя для іх уборы я свядома ўвёў кроі высакародных беларускіх кунтушоў. У апошніх песняроўскіх касцюмах загучалі матывы рыцарскай вобразнасці — інтэрпрэтацыя строяў з беларускіх магнацкіх партрэтаў, са знакава-эмблематычнымі элементамі, што абыгрываюць металічныя часткі баявога адзення. Гаржэткі, налакотнікі, нагруднікі. Выйшаў і на «міжнародную арэну», апрануўшы ансамбль танца «Сібір» з Краснаярску, у рэпертуары якога ёсць беларуская нумары.

Пахвалюся: некаторыя мае работы ўспрымаюцца як знакавыя для мастацкага працэсу і арт-крытыкі «сватаюць» іх у хрэстаматы. Так, ілюстрацыю з маім габеленам «Полацкія званы» ўключылі ў падручнік па беларускай мове.

***— Не прыгадаеце час працы ў Нацыянальным мастацкім музеі?***

— Лічу, што зрабіў унёсак у развіццё музея, прапанаваўшы шэраг ідэй. Гэта датычыцца выдавецкай палітыкі — падрыхтоўкі серыйных альбомных выданняў, іх канцэпцыі. Першы альбом, прысвечаны старому мастацтву, падрыхтаваў сам. Ганаруся, што з маім удзелам сцвердзіўся прыярытэт беларускага мастацтва ў экспазіцыях НММ: музей нацыянальны, і нацыянальнае мастацтва павінна рэпрэзентавацца належным чынам. Пры пасляваеннай дырэктарцы Алене Аладавай Мінск меў замест гэтага музей рускіх «перасоўнікаў» з нязначнымі зменнымі экспазіцыямі на першым паверсе. Заслуга іншай намесніцы дырэктара Надзеі Усавай — прапаганда мастакоў, выхадцаў з Беларусі. Змяніліся знакавыя дробязі: этыкеткі і анатацыі пачалі пісаць на трох мовах, пачынаючы з раней ігнараванай беларускай, пашырылі рэдакцыйны аддзел. І музей набыў рысы цывілізаванага нацыянальнага цэнтра.

Што тычыцца маёй улюбёнай сферы — зрабіў дэталёвыя рэканструкцыі касцюмаў беларускай шляхты для філіі музея, Мірскага замка.

На час маёй працы ў музеі прыпаў міленіум, і мы падрыхтавалі выставу «Беларусь — трэцяму тысячагоддзю», прысвечаную беларускаму мастацтву за 100 гадоў. Канцэпцыю стварыў Барыс Крэпак. Назвалі імёны знакавых творцаў за стагоддзе, адбор твораў даручылі секцыям Саюза мастакоў. А я прапанаваў дапоўніць экспазіцыю творамі музейных калекцый даваеннага перыяду: прадставіць беларускую культуру за ўсе 100 гадоў. І пачынаючы не з 1917, а з 1900 года. Так у экспазіцыю трапілі шэдэўры Міхася Сеўрука, Станіслава Жукоўскага. Мая Яніцкая адшукала ўнікальныя экспанаты ўжытковага мастацтва — пластыку Міхася Філіповіча, цікавыя як знак часу дэкаратыўныя вазы сталінскага ампіру. Сабраўшы ўсё разам, мы асмеліліся на новую, пазбаўленую ідэалагічных штампаў перыядызацыю беларускага мастацтва XX стагоддзя. Высветлілася, што для яго развіцця 1917 год не адыгрываў амаль ніякага значэння. Адзіным стылістычным блокам глядзелася даваеннае мастацтва, ідэі кубізму і экспрэсіянізму развіваліся ў той час непарыўнай лініяй. Наступным быў перыяд таталітарнага мастацтва — ад 1937 года па час смерці Сталіна, са сваімі яскрава выяўленымі формамі і задачамі. Затым «хрушчоўскі» час, адліга, «суровы стыль» 1960-х. Затым — мастацтва 1970–80-х гадоў, і хаця гэта брэжнеўскія часы, менавіта тады плённа фармавалася нацыянальная школа XX стагоддзя з яе адметнасцямі і найбольш яркімі імёнамі творцаў, сённяшніх «карыфеяў». І апошні этап — мадэрнізацыі, шматстылёвасці, ад 1990-х гадоў.

Што датычыцца адчыненай зараз у НММ выставы «Зямля пад белымі крыламі», то яна больш арыентаваная на мастакоў, якія жывуць і дзейнічаюць сёння. Але яе арганізатары вельмі дарэчна выбудоўваюць лінію пераемнасці нацыянальнага мастацтва, дэкларуючы ідэальным арыенцірам 1-ю Усебеларускую мастацкую выставу 1925 года. Прадстаўлены ў асноўным працы з калекцыі Нацыянальнага музея, а факт знаходжання ў ёй — знак годнасці работ. Як штамп — «дзяржаўная каштоўнасць». З другога боку, іх паказ — справаздача дзяржавы перад публікай за накіраванасць падтрымкі мастакоў у апошнія дзесяцігоддзі. Паказ таго, куды ўкладзены грошы падаткаплацельшчыкаў. Узровень выставы добры, моцны. Уражваюць і пакуль не набытыя музеем работы — стыпендыятаў фонду па падтрымцы таленавітай моладзі. У параўнанні з нашым пакаленнем 40–50-гадовых, моладзь працуе для свайго ўзросту больш смела і прафесійна. Пашыраецца мастацкае поле, гарызонты; яны больш бачаць у свеце сусветнай мастацкай культуры, больш вучацца адзін ад аднаго.

***— Давайце вернемся да працы з «Харошкамі».***

— Магу без сціпласці сказаць, што ў адметны рафінаваны стыль «Харошак», дзякуючы якому яны становяцца ўдзельнікамі розных урачыстасцяў, я ўклаў значную долю ўласнага натхнення. «Народныя» і «шляхецкія» касцюмы артыстаў не зусім аўтэнтычныя, гэта стылізаваныя аўтарскія рашэнні, але зробленыя на гістарычным дакументальным грунце. Хачу зазначыць, што творчасць «Харошак» у цэлым не проста харэаграфічнае мастацтва, а нешта большае, істотнае для фармавання нацыянальнай самасвядомасці. Прыгадайце праграмы, пастаўленыя па знойдзеным і апрацаваным Вольгай Дадзіёмавай «Полацкім сшытку», беларускай музыцы еўрапейскага ўзроўню часоў Рэнесансу і барока. Увасобленае ў пластыцы танца і прыгожых формах нацыянальных, хай стылізаваных, касцюмаў, дае душы больш уражанняў, натхнення, чым простая канстатацыя на старонках кніг або школьнага падручніка па культуры. Калісьці на зацвярджэнні праграм даводзілася пераадольваць супраціў неадукаванага чыноўніцтва, якое адпрэчвала высокія формы музычнай і побытавай (увасобленай у касцюме) культуры пад прэтэкстам іх «польскасці». Але супраціў мы пераадолелі.

З «Харошкамі» ў 1991 годзе адбылася мая першая двухмесячная паездка ў Італію, якая была першымі вялікімі замежнымі гастролямі ансамбля — з праграмай па ўзгаданым «Полацкім сшытку». Ехалі «Харошкі» з годнасцю — у камерцыйную паездку, без дзяржаўных датацый і падтрымкі. Мы вандравалі па поўначы краіны — выступалі ў Трыесце ў Тэатры Вердзі, Вероне, Мантуі, Трэвіза, Удзіна, ва ўсёй Ламбардыі, з вялікім поспехам, пры перапоўненых залах. На радзіме ў гэты час адбываліся Віскулі і распад СССР, нам прапаноўвалі застацца ў Італіі ўсім ансамблем. І не дзіва: пастаноўка мела манументальны размах, як заўсёды ў Валянціны Гаявой. Адпаведна, патрабаваліся шыкоўныя касцюмы — і гараджан, і шляхты, і купцоў, і магнатаў, і сялян — з рэканструкцыяй стылю XVII стагоддзя. Ішлі адпаведныя танцы, уключаючы экзатычны нумар з «сакаліным паляваннем», вельмі прыгожа. Запомніўся прыём у гонар артыстаў на старасвецкай віле — з прысутнасцю мясцовай арыстакратыі і спонсараў. І першы тост у гонар артыстаў, які мяне вельмі ўразіў, — за мастака па касцюмах. Першы ў маім жыцці публічныя авацыі. Італьянцаў уразіла тое, што ў балетных танцах можна ўжываць такія маляўнічыя, цяжкія, прыгожыя касцюмы... А я ў паездцы працаваў на пасадзе касцюмера, абавязанага проста цягаць уласнаручна спраектаваныя касцюмы падчас гастрольных пераездаў.

***— Здаецца, дзіцячыя і юначыя вобразы — адны з найлепшых у Вашай творчасці?***

— Магу пагадзіцца: яны былі стрыжнем і майго дыплому, і ранняй работы «Ратуцкія хлопцы» (1985), якая трапіла на Усесаюзную акадэмічную выставу ў Маскве і атрымала ўхвальны водгук вядомага маскоўскага крытыка Аляксандра Марозава — поспех для мастака-пачаткоўца. А яшчэ мяне, натуральна, цікавяць вобразы з гістарычным флёрам, як паказаны на выставе «Зямля пад белымі крыламі» касцюмаваны аўтапартрэт «Госці» (1996) — работа часоў незабыўных выстаў суполкі «Пагоня» сярэдзіны 1990-х, калі гэта мастакоўскае аб'яднанне разам з нашым з жонкай, Аленай Юр'евай, удзелам высока трымала творчы ўзровень.

***

Размаўляючы з Юрыем Піскуном, мы прыгадалі і яго зацікаўленасці старажытным мастацтвам, якія ўвасабляюцца ў творчыя праекты. У шыкоўны каляндар «На скрыжаванні еўрапейскіх дарог. Беларускія абразы», выпушчаны ў Мілане тыражамі на рускай, італьянскай, нямецкай, французскай мовах, — дзеля папулярызацыі айчыннай культурнай спадчыны за мяжой. У стварэнне рэлігійных карцін для касцёлаў і абразоў для цэркваў. Зараз у рабоце — рэканструкцыя на дошцы аўтэнтычным памерам (каля 2х2 метры) і ў гістарычнай тэхніцы на ляўкасе страчанага цудатворнага абраза XVII стагоддзя Забельскай Божай Маці з-пад Слуцка. І шмат у што іншае. Калі б Піскун быў музыкам, да яго б пасавалася вызначэнне «чалавек-аркестр». Як сказаць пра шматграннага ў сваіх талентах мастака — хай мяркуе чытач.

ЦІКАВА

# ЭЛЕКТРЫЧНЫЯ ГІСТОРЫІ ІСТЭРЫЧНЫХ ІДЭЙ

Андрэй РАСІНСКІ

**Вы ўключаеце тэлевізар. Токі працінаюць прастору. На вас абрынаецца: «Пачысцім вам аўру! Энергетыка так і прэ! Зорка ў шакаладзе! Гіпнатычныя вібрацыі!»**

А ў прэсе: «Палітычная харызма Аляксандра Лукашэнкі, на мой погляд, гэта як Боінг–602», — дзеліцца самым важным дама. «Або проста як крэпасць, што лётае, — падтаквае іншая. — Ці нават калі дзве «паветраныя крэпасці» адна на адну паставіць і пару хмарачосаў зверху».

Ляцяць з-пад варштатаў іскры. Але падобныя словы шоў ужо гучалі. Калі навука ладзіла шоў, інжынеры захапляліся акультызмам, а электрычныя ідэі знаходзілі істэрычных прыхільнікаў.

## Шоў Франца Месмера

Да гэтага чалавека цягнуліся людзі. Тысячы жанчын прагнулі дакрануцца да яго. Яны каталіся па падлозе, біліся ў сутаргах і стагналі. Яны плакалі і суцяшаліся; ім станавілася лепей. А ён папросту стаяў над імі, імпазантны і ветлівы, — і рабіў пасы.

Знаёмцеся — Франц Антон Месмер. Нарадзіўся ў 1734 годзе ў Аўстрыі. Сябрамі Месмера былі Гайдн, Глюк і Моцарт, якія патуралі ягоным музычным заняткам. Але Месмер абраў навуковы і медычны шоў-бізнес.

У 1774 годзе ён прыклаў да грудзей істэрычнай фрэйлен Эстэрлайн, якой ужо нічога не дапамагала, магніт. Дотык спыніў істэрычны прыступ.

Месмер выступіў з ідэяй «магнетычных флюідаў», якія працінаюць сусвет. Флюіды быццам бы назапашваюцца і кіруюцца магнетызёрам. З дапамогай магнітаў і асабістага магнетызму можна зладзіць правільны ток флюідаў і палепшыць здароўе.

Электрычныя ідэі Месмера атрымалі розгалас. Хвацкі лекар Джэймс Грэхэм адкрыў у Лондане «Палац здароўя», дзе пацыентам прапаноўвалі за шалёныя грошы паспаць на ложку, усталяваным на сарака намагнічаных калонах. Сам Месмер меў пацыентаў пры венскім двары. Але неўзабаве ўсчаўся скандал.

Месмер неяк выпраўляў «флюіды» ў фаварыткі імператрыцы Марыі Тэрэзіі Парадзіс, сляпой ад нараджэння. Неўзабаве сляпая набыла зрок. Але камісія Венскага ўніверсітэта заявіла, што зрок да пацыенткі не вярнуўся, і гэта ўсё — намаўленне. Марыя Тэрэзія аслепла зноў.

Месмер уцёк у Парыж, дзе адкрыў сваю клініку. Ён з'яўляўся перад пацыентамі як жрэц — у фіялетавай тозе, пільна глядзеў ім вочы, суцяшаў загадкавым голасам. У паўзмроку з чанаў намагнічанай Месмерам вады да пацыентаў цяклі «флюіды».

Неўзабаве Месмер заявіў, што намагнічвае ўжо дрэвы, лясы і паркі. Арыстакраткі штурмавалі ягоны дом. Грамадства калаціла. Месмерам зацікавіліся Людовік XVI і Марыя-Антуанета. Яны прапанавалі Акадэміі навук праверыць дзейснасць новага лекавання.

Праверкай «месмерызму» занялiся Бэнджамін Франклін (які ў той час быў амбасадарам у Парыжы), хімік Антуан Лавуазье, астраном Жан Байі і доктар Гільятэн (з чым вынаходніцтвам у хуткім часе блізка пазнаёміцца французская эліта). Высокая камісія прыйшла да высновы, што ніякага «жывёльнага магнетызму» не існуе, а лекавы эфект — цалкам намоўлены «магнетызёрам».

Фактычна ж Месмер выкарыстоўваў гіпноз (тады яшчэ не адкрыты) і магнітатэрапію (тым болей тады не вядомую). Слушныя вынаходкі падпарадкоўваліся шоў і акультнаму балагану, у які спаўзала ўзгаданая асветнікамі перадрэвалюцыйная Францыя.

## Гальванічныя бітвы ажыўленых жабаў

Ідэі «жывёльнага магнетызму» атрымалі працяг. Калі грымела слава Месмера, багаслоў і анатам Луіджы Гальвані зацята ставіў эксперыменты з лапкамі жабы. Ён знайшоў, што калі нерв адрэзанай лапкі прыкласці да жалеза, а саму лапку да срэбра, то яна скарачаецца. Можна было наладзіць цэлае «жабіна прадстаўленне», калі лапкі скарачаліся і скарачаліся. Гальвані абвясціў, што мае справу з «жывёльнаю электрычнасцю».

З ім не пагадзіўся Алесандра Вольта. Стваральнік першай масавай батарэйкі (вольтавага слупа) лічыў, што крыніца электрычнасці — цалкам вонкавая. Гэта розныя металы, злучаныя праз салявую вадкасць. Сам жывёльны прэпарат — пасіўны.

Гальвані прымусіў жабіну лапку дрыгацца — толькі ад аднаго гатунку металу. Вольта заўважыў, што метал з дамешкамі. Гальвані пачаў выкарыстоўваць шкляныя скальпелі — лапкі ўсё роўна скарачаліся. Як часта здараецца ў навуцы, рацыю мелі абодва даследчыкі. У жывым целе, сапраўды, маюцца токі — толькі вольтавай прыроды.

Але тут у гальванічныя бітвы ажыўленых жабаў умяшалася вялікая палітыка. Напалеон, які акупаваў Італію, звольніў Гальвані з Балонскага ўніверсітэта за адмову прысягнуць марыянеткавай Цызальпінскай рэспубліцы. Вольта ж імператар, наадварот, асыпаў узнагародамі: быў выраблены адмысловы медаль, зацверджана прэмія ў 80 000 экю.

У 1801 годзе фізік паказаў імператару «вольтаў слуп». Для дэманстрацыі ягонай дзейснасці Вольта выкарыстоўваў гальванічныя метады свайго апанента: часткі цела ў жабаў, саламандраў, змеяў, птушак, мышэй дрыгаліся, курчыліся, скалыналіся.



На вачах уражанага імператара мёртвая плоць ажывала.

## Месмерыст Фрыдрых Энгельс

Эксперыменты Вольта і медычныя шоў Месмера натхнілі паэта Эдгара По на «гутарку з жывой муміяй». Мэры Шэлі стварыла свайго «Франкенштэйна». Але ў электрычных ідэй знайшліся небяспечнейшыя прыхільнікі.

У 1870-я гады Фрыдрых Энгельс разам з невядомым прыяцелем, зыходзячы з, па вызначэнню класіка, «нашага фрывольнага скептыцызму», паставілі эксперымент з хлопчыкам, каб атрымаць новыя аргументы ў барацьбе супраць спірытаў.

Палемізаваў Энгельс з Альфрэдам Уолесам (дарэчы, стваральнікам разам з Дарвінам тэорыі эвалюцыі), які выдаў кнігу пра спірытызм. Другім ворагам быў яшчэ адзін спірыт — Уільям Крук, вынаходнік талію і радыёметру. Спірытызм, калі заклапочаныя асобы з дапамогай медыума «кантактавалі з духамі», быў своеасаблівым працягам практыкі Месмера. Калі раней адэпты сядзелі вакол «намагнічанага чана», то цяпер яго замяніў стол. Спірыты ўпадалі і гіпнатычны транс.

«Мы зацікавіліся гэтымі з'явамі і сталі спрабаваць, у якой ступені іх можна ўзнавіць, — піша заснавальнік марксізму-ленінізму пра свой месмерычны досвед. — Суб'ектам мы абралі аднаго жвавага дванаццацігадовага хлапчука. Нерухомым позіркам, скіраваным на яго, ці лёгкім пагладжваннем няцяжка было выклікаць у яго гіпнатычны стан <...> Акрамя лёгка атрыманага струпянення мускулаў і страты адчувальнасці мы маглі канстатаваць стан поўнай пасіўнасці волі ў спалучэнні з адмысловай звышузбуджанасцю пачуццяў <...> Для нас было вельмі лёгка прымусіць дзейнічаць галееўскія чарапныя органы; мы пайшлі яшчэ далей: мы не толькі маглі замяняць іх адно адным і размяшчаць іх па ўсім целе, але і фабрыкавалі любую колькасць яшчэ іншых органаў — органаў спеваў, свісцення, дудзення, танцавання, баксіравання, кравецтва, шавецтва, палення і г.д., змяшчаючы туды, куды нам будзе заўгодна. <...> Мы адкрылі ў вялікім пальцы нагі орган ап'янення, і дастаткова было нам толькі крануць яго, як мы атрымлівалі цудоўную камедыю ап'янення, — ад душы радуецца Энгельс і падсумоўвае: — Створаныя такім чынам органы захоўвалі потым сваю сілу раз і назаўсёды таксама для ўсіх пазнейшых усыпленняў».

Па-свойму паказальны факт: з амаральнага, па сутнасці крымінальнага, эксперымента пачынаўся сацыяльны эксперымент.

## Камунізм мінус электрыфікацыя

«Камунізм — гэта савецкая ўлада плюс электрыфікацыя ўсёй краіны», — сцвярджаў Уладзімір Ленін. Калі сыходзіць з гэтай формулы, то савецкая ўлада — гэта камунізм мінус электрыфікацыя.

Пры гэтай савецкай уладзе святло ідзе не ад току, а ад «лямпачкі Ільіча», крывавы тыран — гэта Сонца і «светач», а камуністычная партыя — заўжды ззяе. Саветы абвяшчалі пра «святло розуму» — і насаджалі дагматычнае цемрашальства. З людзей рабілі Франкенштэйнаў пад гіпнозам ідэалогіі.

Але людзьмі не абмяжоўвалася. У 1978 годзе ў Адэсе быў заяўлены даклад пра «электрычную актыўнасць мозга ў постлетальны перыяд». Нагадаю, што «постлетальны» — гэта пасмяротны, а галоўны крытэр смерці — адсутнасць у мозга электрычнай актыўнасці. Чараўнікі з інстытуту біялагічнай фізікі ажыўлялі з дапамогай электрамагнітнага выпраменьвання адрэзаную галаву труса.

Гэты кашмарны эксперымент быў забыты. Затое іншыя «месмерычныя радасці» напоўніцу праявіліся, калі савецкая ўлада канала. На экраны вылез «гіпнатызёр» Кашпіроўскі і доктар Алан Чумак, які з тэлевізару ўдумлівымі пасамі «зараджаў ваду і крэмы».

Цемрашальская «электрычная містыка», што падсілкоўвала рэжым, незадоўга да яго смерці сталася відавочнай.

## Партыйны аргазм Вільгельма Райха

Увогуле, левыя чулыя да «электрычнай містыкі». У XX стагоддзі марксіст і фрэйдыст Вільгельм Райх амаль даслоўна паўтарыў «флюідныя» ідэі Франца Месмера і надаў ім партыйную афарбоўку.

Галіцыйскі вучань Зігмунда Фрэйда і прапаведнік сексуальнай рэвалюцыі Райх у 20-я гады быў выключаны з камуністычных шэрагаў за фрэйдызм, а з псіхааналітычнай арганізацыі — за марксізм.

У Злучаных Штатах, куды Райх перабраўся, ён агучыў свае ідэі пра так званы «аргон». Як і месмераўскія флюіды, «аргон» працінае сусвет і цыркулюе па целе. Як і флюідам, гэтаму аргону трэба забяспечыць свабодны рух, пазбавіць яго ад затораў і пробак.

Паводле Райха, заторы ствараe панцыр з цяглиц, з якога і неабходна вызваліць цела. Райх не хавае, што цела гэта — сексуалізаванае: «Аргон вызваляецца падчас аргазму. Менавіта ягонае ззянне бачылі касманаўты ў космасе».

Райх пачаў ствараць апараты для назапашвання аргону, каб «лячыць рак і прамянёвую хваробу». Але амерыканцы кінулі Райха ў турму, дзе ён і памёр у 1957 годзе.

Прыхільнік Райха Душан Макавееў зрабіў пра яго стужку «В. Р. Містэрыя арганізму». У гэтым фільме ёсць дакументальныя кадры, дзе жанчыны крычаць, стогнуць, катаюцца па падлозе.

## Флюіды рэйтынгу

«У Прэзідэнта — флюіды, а ў іншых што? — заяўляла мне адна аматарка іскнай улады. — І рэйтынг, рэйтынг, рэйтынг які!»

Бедныя флюіды! Бедны рэйтынг! Бедныя словы — ашмёткі колішніх «акультна-навуковых» і палітычных маніпуляцый.

Парушальнік спакою Франц Месмер са сталіцы нечакана знік. Ён жыў у правінцыі так незаўважна, што многія прыхільнікі лічылі, што іхні кумір 20 гадоў як памёр.

Усе апошнія гады жыцця «магнетызёр» аддаваў музыцы.

АГЛЯД

# ВЫСТАВЫ Ў СЯРЭДЗІНЕ ВЕРАСНЯ

Аляксей ХАДЫКА

**Бягучыя дні парадуюць мінчукоў адразу трыма новымі выставамі фатаграфіі, якія прадстаўляюць майстроў розных краін са своеасаблівымі поглядамі на жыццё і навакольны свет, рознымі канцэптуальнымі падыходамі да мастацтва спыненага імгнення.**



У малой галерэі Музея сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасці, 47) з 7 па 25 верасня швейцарскі фатограф П'ер Уільям Анры, які ладны кавалак жыцця адпрацаваў фотакарэспандэнтам і аб'ездзіў палову свету, прапануе экспазіцыю пад назвай «25 секунд». У невялікай прасторы аўтар сабраў калекцыю не зусім звычайных ню — прыгожых жанчын у кантэксце атрыбутаў жыцця індустрыяльнай эпохі.

Тым не менш для П'ера Уільяма Анры жаночая прывабнасць — не просты аб'ект эстэтычнапачуццёвага сузірання, жанчына — «пачатак усіх пачаткаў», «новая Венера, Мадонна, Алімпія». Індывідуальнасць мадэляў супастаўляецца са светам прадметаў, якія іх абкружаюць, утвараючы партрэт у інтэр'еры, у прасторы асабістай свабоды і гармоніі.

Італьянская амбасада з 15 верасня па 10 кастрычніка запрашае наведаць у Нацыянальным гістарычным музеі (вул. К. Маркса, 12) арганізаваную ёй выставу «Дамы-музеі: вытанчаны стыль італьянскага жыцця». Праект музеязнаўцы Разаны Павоні ў супрацоўніцтве з рымскім фатографам Амарам Кейраўі дазваляе публіцы ажыццявіць візуальнае падарожжа па дзесяці італьянскіх дамах-музеях, прывабных разнастайнасцю стыляў жыцця розных эпох. Тут прадстаўлены віла Джузепе Вердзі ў Эміліі, каралеўскія апартаменты сям'і Савоя ў Турыне, палацы, гарадскія кватэры і сельскае жытло.

Кожнай серыі фотаздымкаў інтэр'ераў і знешняга выгляду будынкаў папярэднічае партрэт гаспадара, чый стыль жыцця і густ вызначылі характар архітэктуры і аздаблення памяшканняў. Як і швейцарскі фатограф, аўтары прачытваюць лёс чалавека праз свет рэчаў, якія яго атачаюць, з той розніцай, што абіраюць героямі канкрэтных гістарычных асобаў у пэўнай часавай і геаграфічнай кропцы.

З 16 верасня па 6 кастрычніка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (пр. Незалежнасці, 116, галерэя «Панарама») дзейнічае выстава «Беларусь і Францыя: фатаграфічныя паралелі». Фотамайстар з Францыі Цьеры Клеш і беларускія фатографы Вольга Лойка і Віктар Байкоўскі спрабуюць паказаць у сваіх работах падобныя эмоцыі і ўражанні, паралелі, якія можа нарадзіць у людзей з розным досведам, культурай, светапоглядам і ў розны час гарадская прастора.

Мэта сумеснай творчасці двух беларусаў і француза — пошук адзінства вобразаў горада і гарадскога жыхара, аднолькава і адлюстраванага ў гарадскім асяроддзі, і адчужанага ад яго на розных канцах еўрапейскага кантынента. Суадносіны чалавек—наваколле тут разглядаюцца не на фоне кутка прыватнага інтэр'ера, а ў атачэнні вуліц і плошчаў, маштабнай шкалы, якая не столькі фармуецца асобай, колькі дамінуе над ёй.

Падобна як на анансаваных фотавыставах архітэктура робіцца выразным сродкам, які выкарыстоўвае фотамастак, у канцэптуальнай экспазіцыі «М-Галерэі» Інстытута імя Гётэ ў Мінску (вул. Фрунзе, 5) «ЛІТАRA. Візуальныя даследаванні паэзіі», якая працуе з 8 па 30 верасня, сучасныя беларускія мастакі прапануюць свае інтэрпрэтацыі тэкстаў сучасных нямецкіх паэтаў.

Убачыць, што атрымліваецца пры візуалізацыі графікі літар і тэксту — перакладзе не толькі з мовы на мову, але і з сістэмы слоўнай у сістэму пластычнай кадыфікацыі (у жывапісе, графіцы, інсталяцыі), — дапамагаюць Руслан Вашкевіч, Міхаіл Гулін, Сяргей Кірушчанка, Зоя Луцэвіч, Вольга Сазыкіна і іншыя вядомыя аўтары. Як адзначаюць куратары праекта, яго ідэя — раскрыць «нечаканыя сэнсавыя кантэксты, што ўзнікаюць на стыку дзвюх культур і двух відаў мастацтва».

Нарэшце, у галерэі «Вільнюс» (вул. Каліноўскага, 55) з 9 верасня па 12 кастрычніка шукальнікі новых імёнаў у сузор'ях беларускіх служкаў муз маюць магчымасць пазнаёміцца з калектыўнай экспазіцыяй маладых беларускіх жывапісцаў, скульптараў і графікаў, чые работы ўжо адзначаны добрым узроўнем майстэрства. Назва «Вокны», якая яднае 50 экспанаваных работ, розных па стылістыцы — ад рэалістычнай да сюррэалістычнай, увасабляе сімвалічны ключ да канцэпцыі выставы. Вокны — гэта адкрытая прастора для выказвання сваёй творчай індывідуальнасці, погляду на свет, перажыванняў душы і сэрца.

ФЭСТ

# СКАЖЫЦЕ, ДЗЕ Ў ВАС «МОЖНА»?..

Алеся СЕРАДА

**Калі шукаць на Украіне горад, найбольш падобны да Мінска, то гэта, хутчэй за ўсё, гэта будзе Харкаў.**


Гурт Pur:Pur

Тут жыве ўсяго каля паўтара мільёнаў чалавек, аднак і гарадскія маштабы, і маршруты, і краявіды пададуцца мінчаніну камфортнымі, хіба што ў метро тут не дзве, а тры лініі. Нават сітуацыя з украінскай мовай тут чымсьці нагадвае становішча з беларускай мовай у Мінску: можна жыць тут і ўсё жыццё размаўляць па-руску, і пры тым заставацца часткай лакальнай, аднак магутнай культурнай прасторы, якую ніхто не пасаромеецца таксама назваць украінскай.

Калі палічыць, колькі па Беларусі гастралюе гуртоў з блізкага замежжа, то Харкаў нечакана акажацца сярод лідэраў. Напэўна, першы калектыў адтуль, які мы пачулі яшчэ напрыканцы дзевяностых, — «Танок на майдані Конґо», што парадаваў мінскіх фанатаў ды фанатак сваім прыездам яшчэ ў далёкім 2002 годзе. Пасля да нас рэгулярна наязджалі культавыя тэатралы-растаманы «5'nizza», а зараз штогод дэманструюць сольныя праекты яе былыя чальцы — Сяргей Бабкін ды «SunSay». Ды і сябры былой «5'nizza» — электронны праект «Lюk» — таксама неаднаразова ў нас бывалі. Разам з імі, пакінуўшы самыя прыемныя ўражанні, прыязджалі таксама электронныя, аднак больш джазава-інструментальныя «Ч.А.Й.К.А.».

І вось — малады гурт «Pur:Pur», які з поспехам выступіў на беларускім фестывалі «Аксамітавы сезон», што быў праведзены «UniArtPro» ды «Bo promo». Яго музыка, якую самі ўдзельнікі пазначаюць як «лёгкае слуханне» і «мінімалізм», больш за ўсё падобная на тое, калі б узыходзячая зорка соўлу або былая вакалістка культавага трып-хоп-гурта заспявала з сябрамі акустыку або сола, як гэта было з Roisin Murphy («Moloko»), Skye Edwards («Morcheeba»), або з Bajka, што час ад часу дорыць вакалы Bonobo. Музычная эвалюцыя развіваецца супраць ходу гадзінніка: відаць, хутка Харкаў будзе мець сваё «Moloko» або нешта яшчэ цікавейшае. Самі музыкі тлумачаць назву гурта праз лаціну — «чысты-чысты». Але ж гук «purr» — гэта па-англійску яшчэ і муркатанне коткі. Какетліва-манерныя лісліва-кашэчыя ноткі — адна са шматлікіх «разынак» вакалісткі Наты Смірынай, чый вакал дзіўным чынам нагадвае амерыканскіх спявачак з «каляровымі» каранямі.

Нельга сказаць, каб «Pur:Pur» былі зоркамі ў сябе на радзіме. Калі спытаць пра іх шарговага харкаўчаніна, то ён, хутчэй за ўсё, акажацца з імі незнаёмы, хоць, мабыць, і ўзгадае якіх-небудзь сяброў сваіх сяброў, што, здаецца, іграюць нешта падобнае. Аднак «Pur:Pur» прапануюць музычны матэрыял сапраўды сусветнай якасці, і побач з вядомымі аўстрыякамі «Parov Stellar» яны глядзеліся цалкам годна. І гэта — усяго толькі «яшчэ адзін цікавы гурт з Харкава»...

Зазначым, што, калі здзяйсняецца культурны абмен і беларусаў вязуць у Харкаў (або Адэсу, або Кактэбель), то на экспарт звычайна выпраўляецца «наша ўсё»: «Сярэбранае Вяселле» — супергурт андэграўнда ды «CherryVata» — найпаспяховыя правадыры электронікі ў масы. Бо хто, калі не яны? Хоць, трэба зазначыць, украінскія госці засведчылі: гэтыя два нашы гурты яны сапраўды ведаюць і шануюць.

Магчыма, розніцу паміж харкаўскай ды мінскай музычнай сцэнай найярчэй адлюстроўвае наступнае пытанне. Калі ў «Pur:Pur» спыталі: «Ці зарабляеце вы на жыццё музыкай?», то яны адказалі: «Так!» Колькі непапсовых мінскіх выступоўцаў маглі б адказаць тое самае? І колькі з іх мелі б менш за сорак гадоў? Ці ёсць у нас наогул магчымасць зарабляць, не іграючы па вечарах рок-хіты ў адной з пяці ўсім вядомых дарагіх рэстарацый?

«Дык чаго ж вы хочаце ад Мінска?.. Тут вам не Масква і нават не Кіеў!» — можна пачуць ад некаторых модных тусоўшчыкаў або «залатой» моладзі, што едуць за культурным жыццём, вартым іх амбіцый, куды падалей. Не будзем з імі спрачацца. Давайце параўноўваць параўнальнае. Калі не казаць пра сталічныя амбіцыі, шмат у чым Харкаў — гэта нібыта лепшы Мінск. У ім досыць альтэрнатыўных гуртоў ды канцэртных пляцовак, паспяхова існуюць некамерцыйныя кінаклубы і літаратурныя кавярні, рэгулярна праходзяць то буйныя арт-падзеі, то ўсялякія фестывалі хэнд-мэйду. Што замінае нам? Ізноў жа, грашовае пытанне? Герметычнасць культурнай прасторы? Міфалагічная "агульная млявасць"?

На прэс-канферэнцыі, што адбылася напярэдадні фестывалю «Можна», арганізатары Аляксандр Багданаў ды Дзмітры Шапялевіч агучылі сваю надзею і мару, да якой яны вядуць нас, як нам вядома, ужо шмат гадоў: Беларусь як паўнавартасны музычны цэнтр Усходняй Еўропы (а Мінск, відаць, — адпаведная культурная сталіца). Да такой вялікай мэты трэба рушыць паступова, і вось вам наступная прыступка: каб кожны год у Харкаве чулі пра яшчэ адзін добры новы мінскі гурт. А можна, і пра два.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.
ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
НАДРУКАВАНА ў друкарні УП "Плутас-Маркет". г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.
Замова № 905

Падпісана да друку 17.09.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.